Дзед Мароз і фабрыка самагонкі ☞ 5

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960 NR INDEKSU 366714

Густаў Галёўбэк ☞ 9

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 9 (2651) Год LII Беласток, 4 сакавіка 2007 г. Цана 2,00 зл. (VAT 0%)

Новае аблічча БАСу?

Няўстойлівасць і дынаміка — гэта рысы характэрныя сучаснаму грамадству. Ад пачатку трансфармацыі ў Польшчы ўзровень грамадзянскай актыўнасці павышаецца. Гэта абазначае, што прапановы няўрадавых арганізацый прыцягваюць увагу штораз то новых асоб, паўстае своеасаблівая канкурэнцыя. Каб перад ёю абараніцца, варта пакарыстацца практычным законным прынцыпам, якім з'яўляецца тэрмін паўнамоцтваў. Гэта гарантыя пераемнасці ўлады, спосабу дзейнасці і крыніца новых ідэй.

фота Ілоны КАРПЮК

Радаслаў Дамброўскі (злева) з Ігарам Іванюкам

Беларускае аб'яднанне студэнтаў, як кожная іншая арганізацыя, мае свой рытм працы. У гэтым выпадку двухгадовы тэрмін вызначае час працы Галоўнай рады і старшыні. Гэта перыяд, у ходзе якога трэба ажыццявіць свае думкі, прапановы, гэта таксама час, каб пераканаць усіх навокал да сэнсу сваёй працы і яе якасці, а я добра ведаю, што гэта няпростая справа.

Прайшлі два гады. Закончылася змаганне апошняй каманды. Умовы дзейнасці часта захоплівалі знянацку. Напэўна паўплываў на гэта кантэкст „беларускай рэвалюцыі", што часта мабілізавала да канкрэтнай дзейнасці. Сёння ўжо абраныя новыя ўлады БАСу (у пятніцу 23 лютага), пачынаецца чарговы перыяд у дзейнасці арганізацыі. Але ці можам чакаць вялікіх зменаў? Цяжка адказаць адназначна. Рашучых змен у асабовым саставе ўправы не было: асталіся Нікан Шэрэмэта ды Ігар Іванюк, якія раней былі першы скарбнікам, а другі сакратаром. Функцыю скарбніка пераняў Марк Браньскі, упершыню ў радзе. Разам з ім „да ўлады" прыйшлі першакурснікі: Марцін Чабай, Павел Шайкоўскі і Мажэна Саевіч, якая стала сакратаром. Намеснікам старшыні стаў Андрэй Курчук, а ў Галоўную раду вярнуўся Павел Бушко. Хто стаў старшынёю — лёгка прадбачыць, менавіта Радаслаў Дамброўскі, які два апошнія гады выконваў функцыю намесніка старшыні і добра ведае працу ў арганізацыі. Сітуацыя аднак памянялася і таму трэба вырашаць у які бок пайсці. Дзе апынецца пасля сваіх двух гадоў новы прэзідэнт басаўскай рэспублікі — пабачым, а пакуль што спытала я яго пра пару важных і неабходных спраў.

Ілона Карпюк: — Не ад сёння і не ад учора Ты ў БАСе. Што адчуваеш пасля выбараў?

Радаслаў Дамброўскі: — Праз хвіліну пабачыў я страх у вачах, асабліва калі ўспомніў Тваю справаздачу. Тады давёў я да сваёй свядомасці веліч працы, якая мяне чакае. Але прынамсі ведаю да каго звяртацца з усялякімі пытаннямі і хаця б таму адчуваю нейкі камфорт.

— Якія цяпер думкі кружацца ў Тваёй галаве?

— Да канца я не быў падрыхтаваны на такі паварот акцыі. Таму і ўсяго яшчэ я не перадумваў дакладна, але вядома, што думкі і планы кружаць па галаве. Цяпер будзем разглядаць бліжэйшыя мерапрыемствы, напрыклад, студэнцкія дні культуры. Трэба будзе таксама думаць пра маладых. Цяжка сёння захвоціць іх да бясплатнай працы.

— Што Радэк Дамброўскі дасць БАСу з сябе?

— Рукі.

— Толькі?

— Ну не, зразумела. Перш за ўсё буду прабаваць спалучыць працу журналіста з абавязкамі старшыні. Праца займае мне шмат часу, таму цяпер галоўнай задачай будзе знайсці нейкую раўнавагу.

— Якія прыярытэты вызначыш БАСу на гэты момант?

— Галоўная мэта — прыцягнуць новых, перш за ўсё малодшых людзей. Але вядома, што захаванне беларускай тоеснасці заўсёды было важнай мэтай, а з характару арганізацыі вынікае патрэба заахвочвання да працы ды заангажаванай дзейнасці.

— Гэта вельмі агульная праграма...

— Так. З больш канкрэтных спраў напэўна ўмацуем супрацоўніцтва з беларускім бокам. Маем намер наладзіць цыкл семінараў, звязаных з журналістыкай, чым раней займаўся Цэнтр грамадзянскай адукацыі Польшча — Беларусь. Я нават размаўляў ужо на гэтую тэму. Проста, трэба пакарыстацца кантактамі, якія ўжо наладжаны. Думаем таксама, каб у будучыні вывесці фестываль „Басовішча" з Гарадка на большую прастору.

— Як ставішся да праблемы новых членаў, асабліва маю на думцы ліцэістаў?

— Ужо даўно думаем пра змены ў статуце. Яны неабходныя, каб і ліцэісты мелі роўныя магчымасці з нашымі. Не ўдалося, на жаль, правесці галасавання на гэтым сходзе па празаічнай прычыне — не было кворуму неабходнага для ўвядзення змен у статут.

— Але як рэальна забяспечыць яўку, прыцягнуць людзей?

— Найлепш паказаць як выглядае наша праца. Гэта можа быць самым простым спосабам. Можа гэта смешна прагучыць, але нават калі маладыя прыглядаюцца як бегаем з ідэнтыфікатарамі пры розных мерапрыемствах, як змагаемся, і як цешымся, і адчуваем задавальненне ад вырашэння важных спраў, здаецца, гэта і ёсць нейкі спосаб, каб іх заахвоціць.

— Якім будзе БАС праз два гады, калі закончыш гэты тэрмін паўнамоцтваў?

— Гэта будзе відаць толькі праз два гады. Хачу проста, каб БАС працаваў нармальна. Напэўна не дапушчу, каб пры мне закончыў ён сваю дзейнасць.

— Жадаю тады поспехаў.

— Дзякуй.

Ілона КАРПЮК

Жарсці кангрэсменаў ☞ 2

Віктар САЗОНАЎ

Старадаўняе Гродна на мінулым тыдні зноў наведалі апазіцыйныя лідэры нацыянальнага маштабу. Цяпер, каб пагаварыць пра Кангрэс дэмакратычных сілаў, які планаваўся на пачатак гэтай вясны. Ды ўсё пайшло не так гладка, як хацелася, і зараз не толькі ўжо агучаная дата, але і сама мажлівасць правядзення таго з'езда стаіць пад пагрозай...

Тайнае дроб сакрэтнае ☞ 3

Раіна СТЭФАНЧУК

Дакладна ў той дзень, калі Польшча ўпершыню святкавала еўрасаюзны Дзень аховы персанальных даных, на пісьмовыя сталы падляшскіх самаўрадаўцаў трапіў ліст з патрабаваннем падаць даныя, м.інш. імёны і прозвішчы асоб, якія балатаваліся на апошніх самаўрадавых выбарах і выводзяцца з асяроддзя нацыянальных і этнічных меншасцей. Патрабавала гэтага Міністэрства ўнутраных спраў і адміністрацыі праз пасрэдніцтва ваяводы. Ці парушаны быў закон аб персанальных даных? І навошта міністэрству такая інфармацыя?...

www.bialowieza.cerkiew.pl

Белавежскі прыход ☞ 4

Пётр БАЙКО

Бурліць жыццё ў Праваслаўным прыходзе св. Мікалая ў Белавежы. Штогоду ў хроніку царквы запісваюцца новыя падзеі. А якім быў мінулы, 2006 год? Можна сказаць, што нядрэнны. Нягледзячы на фінансавыя цяжкасці, удалося рэалізаваць шмат важных інвестыцый і планаў...

Пра Багдановіча ў Гайнаўцы ☞ 8

Аляксей МАРОЗ

У прысутнасці паслоў Беларусі, Азербайджана, Арменіі, Казахстана і Малдовы 17 лютага ў Музеі і асяродку беларускай культуры ў Гайнаўцы адбылося адкрыццё выстаўкі „Пясняр чыстай красы", прысвечанай творчаму і жыццёваму шляху класіка беларускай літаратуры Максіма Багдановіча. Дыпламаты такога рангу наведвалі раней Гайнаўку толькі пры нагодзе Міжнароднага фестывалю царкоўнай музыкі. Цяпер гасцямі хутка заапекаваліся самаўрадаўцы, а мясцовыя прадпрымальнікі выявілі ахвоту сустрэцца з імі...

9 770546 196000

Жарсці кангрэсменаў

Старадаўняе Гродна на мінулым тыдні зноў наведалі апазіцыйныя лідэры нацыянальнага маштабу. Цяпер, каб пагаварыць пра Кангрэс дэмакратычных сілаў, які планаваўся на пачатак гэтай вясны. Ды ўсё пайшло не так гладка, як хацелася, і зараз не толькі ўжо агучаная дата, але і сама мажлівасць правядзення таго з'езда стаіць пад пагрозай.

А пачыналася прыгожа. Паколькі дэмакратычныя сілы здолелі аб'яднацца, то трэба выпрацаваць агульную стратэгію і тактыку, публічна перад усім народам зацвердзіць яе на будучым Кангрэсе і разам ісці да поўнай перамогі. І механізм адбору кандыдатаў на тое важнае мерапрыемства таксама зацвердзілі. Імі становяцца тыя, хто здолеў сабраць трыста подпісаў ад выбаршчыкаў сваёй акругі. І ўсё нібыта чын чынам. І правілы гульні ёсць, і адпаведныя структуры кантролю пастаўленыя.

Але, як гэта заўсёды бывае ў беларусаў (з класікам, які першы гэта заўважыў, не паспрачаешся), пачаліся праблемы. А галоўная з іх — лідэрства ў аб'яднанай кааліцыі і, адпаведна, пытанні стратэгіі і тактыкі занялі дзесятае месца. Кшталту таго, хто стане лідэрам, той і будзе вызначаць тактыку. А мы будзем выбіраць лідэра, ды і толькі. І пачалася канкурэнцыя паміж рознымі групоўкамі за тое, хто больш сваіх прыхільнікаў на Кангрэс сцягне. Дайшло да таго, што некаторыя змагары за чэснасць і справядлівасць, якія злосна абвінавачвалі выбарчыя камісіі ў фальшаванні, пачалі самі падрабляць подпісы выбаршчыкаў. І такіх было не так ужо і мала.

Экс-кандыдат у прэзідэнты Аляксандр Мілінкевіч, якога нядаўна палітрада фактычна адхіліла ад кіравання, даўно ўжо заяўляў, і на гродзенскай сустрэчы пацвердзіў, што вагаецца ці браць удзел у гэтым мерапрыемстве, хоць сам на такім і быў абраны. А зараз выставіў умовы, паводле якіх ён і яго прыхільнікі не будуць ігнараваць Кангрэс толькі ў тым выпадку, калі будзе дазволена да дэлегатаў сабраўшых па трыста подпісаў далучыцца прадстаўнікам Трэцяга сектара. І яшчэ калі там будзе пастаўлена пытанне выбараў адзінага лідэра над усёй кааліцыяй. Бо ўсе, хто змог перамагчы таталітарызм, і палякі, і чэхі, і іншыя, усе яны мелі нязменнага лідэра, які праз гады вёў свой народ да перамогі.

Старшыня Аб'яднанай грамадзянскай партыі, былы канкурэнт Мілінкевіча на пасаду „адзінага" Анатоль Лябедзька, на гэты раз заяўляе, што выбіраць лідэра не трэба. Бо ён, той міфічны адзіны лідэр (маўляў, так вучыць гісторыя), або з'яўляецца сам, або яго няма, і таму штучна тую постаць вылучаць не трэба. Не гарыць, нібыта, сёння тое. Час яшчэ дазваляе і трэба даць мажлівасць праявіць сябе ўсім жадаючым. А арыфметычны лідэр (той хто будзе абраны арыфметычнай большасцю галасоў), так і застанецца арыфметычным, а не фактычным. І то толькі для Захаду. І таму спадзявацца, што справа зрушыцца з нейкай карысцю не толькі для яго (таго адзінага), не будзе надзеі.

Вінцук Вячорка, кіраўнік Беларускага народнага фронту, пастараўся засяродзіць увагу на тым моманце, што Кангрэс, як паказальнік адзінства апазіцыйных дэмакратычных сілаў, мерапрыемства жыццёва неабходнае. Бо толькі так можна стварыць суб'ект, з якім будуць лічыцца ўсе, і ўсе будуць улічваць яго погляды на будучыню Беларусі. Не будзе адзінства ў апазіцыі — не будзе такога суб'екта. І тады пра лёс нашай Бацькаўшчыны будуць перамаўляцца, прыкладам, Еўрасаюз з Расіяй, або Вашынгтон з Бруселем, але без уліку думак нацыянальна свядомай апазіцыі.

Прысутныя ў зале гродзенцы ўважліва слухалі сваіх лідэраў і актыўна ўключаліся ў размовы, задавалі безліч пытанняў. І ўсе пра Кангрэс і пра лідэра. Нават ні аднаго разу аніхто не спытаў пра правядзенне 25 сакавіка Дня Волі, хоць Вінцук Вячорка гэтую тэму падымаў у сваім выступленні. Відаць, у беларусаў пытанне: „Хто ж намі пакіруе?" — самае галоўнае. Не можам мы жыць сваім розумам. Не можам без „бацькі". Можа таму „бацька" так доўга намі і кіруе і не збіраецца саступаць месца другому. А на што беларусам два „бацькі"? Яшчэ, хіба, і адным не наеліся, бо важнейшай праблемай па-ранейшаму застаецца: „А хто?"

Віктар САЗОНАЎ

Калоніі і бунт

З цікавасцю прачытаў я допіс спадара Грышы Мароза п.з. „Стараберазоўскі абыход палёў" і аглянуў здымак з 12 мая 1930 года. І падумаў: бадай усе прысутныя на ім людзі ўжо не жывуць і нас гэта скора чакае. Але мяне пацікавіла заўвага, што калі праводзілі камасацыю стараберазоўскіх палёў, хабар каштаваў толькі аднаго жывога барана. Гэта хабар недарагі, бо калі ў нас сталі мераць палі і лугі, дык адзін селянін пайшоў да землямераў, панаракаў, што ён бедны (а гэта было няпраўдай) і не мае каня, і стаў прасіць, каб яму зямлю надзялілі блізка вёскі. Калі пра гэта даведаўся іншы гаспадар, дык зараз сказаў землямерам, што можа ім забіць свайго каня, каб атрымаць добры кавалак зямлі. І дабіўся гэтага, хаця таго каня не забіў, але праз падлізніцтва і знаёмствы атрымаў тое, што хацеў.

У Дубічах яшчэ да вайны тадышнія ўлады хацелі перамераць зямлю па-новаму, каб назаўсёды пазбыцца нявыгаднай цераспалосіцы; па-нашаму — рысак, а па-польску — шахаўніцы. Можна было нават пайсці на выкуп і за вёскай атрымаць на выдзеленым участку добры пляц і на ім пабудавацца. Мой бацька нават быў запісаўся на гэты праект, бо ў вёсцы ягоны пляц быў вузкі і ўвесну залівала яго вада, аднак нічога з гэтага не атрымалася, бо ў 1939 годзе ўспыхнула вайна.

А пасля вайны, так як і да яе, людзі гаспадарылі на сваіх рысках, а новая ўлада стала намагацца загнаць людзей у калгасы, а гэта таксама было справай складанай, бо людзі баяліся калгасаў як агню. У нашай вёсцы толькі адзін каваль, які меў многа зямлі, пачаў часта наведваць нашу гміну і дапякаць чыноўнікаў словамі: „Да почему вы не делаете колхоза? Я буду вас судить!" Калі так, дык гмінныя і партыйныя чыны рашылі арганізаваць у нас калгас і зрабілі гэта восенню 1952 года. Запісалася да яго адзінаццаць гаспадароў, у тым ліку і той каваль. Ён разлічваў, што калі здасць поле пад калгас, тады стануць яго абрабляць дурныя калгаснікі, а ён будзе нешта ў кузні кляпаць і такім чынам на хлеб і да хлеба мець будзе. Не выйшаў ён на працу ў поле адзін дзень, не выйшаў другі дзень, і на трэці дзень яго таксама няма. Тады прыйшоў да яго калгасны брыгадзір Панас, чалавек гарачы, і пытаецца: „Чаму не прыходзіш на поле?" „Скоро приду, но ещё не окончил подковы". На гэта Панас стаў кідаць такім матам, што аж у кузні сцены затрасліся і агонь у горне прытух. „Ты думаеш, што я тваю зямлю буду абрабляць, а ты будзеш у кузні забаўляцца?" — загрымеў ён; амаль кулакі ў рух не пайшлі. Пасля гэтага наш слаўны каваль уцёк з калгаса і прапаў як цень на вадзе. І яшчэ траіх уцякло з калгаса і засталося ў ім толькі сем сем'яў...

У той менавіта час у Дубічах была праведзена першая камасацыя грунтаў і, вядома, была яна ў карысць калгаса, бо калгаснікам былі адведзены Ляшкава і Заклуніча — найлепшыя землі, і Падрызаўшчына — найлепшыя лугі побач вёскі. Траіх нашых гаспадароў, што мелі найбольш зямлі, землямеры пакрыўдзілі найбольш, вядома — па загадзе партыі, каб іх закабаліць у калгас. Аднак яны надалей да калгаса не далучыліся і двух з іх зараз паехалі на Прусы, каб крыху грошай зарабіць і неяк перажыць. А трэці, мой хрышчоны бацька, заявіў, што ў калгас ніколі не пойдзе — лепш будзе пасвіць быдла; і так зрабіў, бо сезон ці два пасвіў кароў у Тафілаўцах.

І так былі ў нас праведзены першыя памеры зямлі. А ці тыя людзі, што не пайшлі ў калгас, былі лепшымі ад калгаснікаў? Нічуць не, а наадварот, бо тыя першыя рабілі шкоды і на платах ды сценах выпісвалі розныя мянушкі і непрыстойныя жарты ў адрас калгаснікаў, а нават білі вокны. Калгаснікі такіх свінстваў не чынілі, мо таму, што была іх толькі жменька ў маштабе ўсяго сяла.

Наступіла восень 1956 года і слаўны Гамулка развалій непрадуктыўныя калгасы: у нас ён таксама развалійся. І трэба было пачынаць новыя памеры зямлі, новую камасацыю, якой людзі вельмі чакалі. Работы пачаліся недзе пад восень 1957 года. Траіх землямераў дзялілі зямлю ў адной вызначанай хаце. Жыхары вёскі выбралі адмысловую камісію з трох чалавек, якая мела сачыць за новым падзелам. У камісію былі выбраны, здавалася, найбольш справядлівыя гаспадары з вёскі. І скора высветлілася, што тыя радныя (чамусьці іх так назвалі) былі „справядлівыя" і „адданыя" толькі выключна сабе, сваякам і падхалімам, а на рэшту яны не зважалі. Сабе яны надзялілі зямлю і сенажаці дзе хацелі...

(працяг будзе)

Мікалай ПАНФІЛЮК

Вачыма еўрапейца

Набздычаныя дзеўкі

Прыкрае, прыкрае ўражанне засталося ад трох месяцаў кіравання палітызаванай падляшскай самаўрадавай улады. І справа нават і не ў выніках, значыць, аб'яўленні новых выбараў і назначэнні камісара, але ў метадах і стылю таго ўсяго, што тварылася ў ходзе трынаццаці сесій ваяводскага Сейміка. Больш таго, наглядаючы за гэтымі тэатралізаванымі сеймікавымі пастаноўкамі, у мяне склалася ўражанне, што амаль ад пачатку скарочанага тэрміну правамоцтваў усё кіравалася якраз да такога фіналу. Чаму? Мабыць, таму, што абедзве найбольшыя групоўкі ў Сеймікі (Права і справядлівасць ды Грамадзянская платформа) на мясцовай сцэне сённяшняга палітычнага жыцця, ды і больш таго, перш за ўсё на цэнтральнай, хочуць даказаць хто мацнейшы, хто павінен трымаць стырно. Вядома, пойдуць на новую самаўрадавую выбарчую кампанію аграмадныя сродкі. Пэўна, таксама не паскупіцца на іх цяперашняя кааліцыянтка ПіС на Падляшшы — Самаабарона, а таксама і апазіцыйныя апрача ГП — ПСЛ і СЛД. Наколькі ведаю, усе гэтыя парламенцкія групоўкі маюць значныя сродкі.

Бянтэжыць не толькі тое, што за тры месяцы 30 ваяводскіх радных не вырашылі нічога істотнага для рэгіёна і што кожны з іх узяў больш за 1 740 злотых камандзіровачных (не ўлічваючы магчымасцей карыстання іншымі прывілеямі) і што новыя выбары могуць каштаваць падаткаплацельшчыкаў-выбаршчыкаў пад 3 мільёны злотых. Больш цікавае тое, каго мы больш за тры месяцы таму выбралі і каго выбярэм цяпер. У прынцыпе, усе трыццаць радных, засаромленых няўмеласцю дасягнуць кампраміс і паставіць дабро рэгіёна над партыйнымі калькуляцыямі, павінны адмовіцца ад новага свайго выбарчага старту. Так, як ужо гэта дэкларавалі радны ад ПСЛ, які прызнаецца, дарэчы, да беларускасці, Мікола Яноўскі. Варта пра гэта памятаць ля выбарчых скрыняў на чарговым выбарчым туры. Генеральна, на жаль, у палітыцы — таксама і на ўзроўню самакіравання — на такое мышленне і дзеянне няма што разлічваць.

Дыялогі з трыбуны і з залы пасяджэнняў нізкага палёту, гучныя кплівыя насмешкі, правінцыйна-тэатральныя жэсты, значыць, тая ўся агіднасць і недахоп класа ў час гэтых трынаццаці сесій з'яўляецца дадатковым доказам, каб, можа, усёй гэтай кампаніі сказаць дзякуй. Прыкладам з'яўляецца тут адзін радны, які ад часу самаўрадавай рэформы засядае ў Сеймікі, а раней быў ваяводам, які быццам бы памыліўся ў час аднаго галасавання. І што з'яўляецца кур'ёзам, патрабаваў новую карту, каб яшчэ раз аддаць свой голас. І далі яму. Ну, што ж, мо гэта мела б значыць, што выбаршчыкі таксама змогуць памыліцца на выбарчых участках? Іншы радны ў сваю чаргу казаў, што з-за памылкі ўкінуў у скрыню лісток з павесткай дня. І г.д., і да г.п.

На шчасце, у палітыцы ёсць таксама святлейшыя асобы, хоць іх усё меней. Вось у час, калі працягваліся пацягушкі ў Сеймікі, 85-годдзе святкаваў праф. Владыслаў Барташэўскі, несумненны аўтарытэт. У час адной сустрэчы выказаў ён фразу, якая абабегла, здаецца, ўсе СМІ і то не толькі ў Польшчы. Кранала яна генеральна сённяшнюю сітуацыю ў Польшчы і паводзін яе прадстаўнікоў на міжнароднай арэне.

— Калі дзеўка не надта вабная і пасажная, дык павінна быць хоць сімпатычнай, а не набздычанай.

Год таму ў размове з „Нівай" прафесар Барташэўскі заявіў: „У Польшчы пануе ўсё фальшывае адчуванне, што дыялог абазначае навязванне сваёй думкі. Без спробы паразумення не можа быць паразумення".

У палітычна-самаўрадавай беластоцкай рэчаіснасці аж хочацца сказаць: „Ну, вось, спадары радныя! Варта слухаць не толькі сваіх партыйных лідэраў, а вось такіх людзей як праф. Барташэўскі". А і лідэраў гэта тычыцца. Ды каб слухаць, трэба і хацець, і ўмець слухаць.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

–>ТАЙНАЕ ДРОБ САКРЭТНАЕ<–

Дакладна ў той дзень, калі Польшча ўпершыню святкавала еўрасаюзны Дзень аховы перасанальных даных, на пісьмовыя сталы падляшскіх самаўрадаўцаў трапіў ліст з патрабаваннем падаць даныя, м.інш. імёны і прозвішчы асоб, якія балатаваліся на апошніх самаўрадавых выбарах і выводзяцца з асяроддзя нацыянальных і этнічных меншасцей. Патрабавала гэтага Міністэрства ўнутраных спраў і адміністрацыі праз пасрэдніцтва ваяводы. Ці парушаны быў закон аб персанальных даных? І навошта міністэрству такая інфармацыя?

— Кожныя пару гадоў міністр унутраных спраў і адміністрацыі мае абавязак падрыхтаваць рапарт у Савет Еўропы аб удзеле нацыянальных меншасцей у публічным жыцці, таксама і ў выбарах, — заявіла ў размове з „Нівай" Данута Главацка-Мазур, якая выконвае абавязкі дырэктара дэпартамента веравызнанняў і нацыянальных меншасцей і прадстаўляе таксама ў гэтай справе віцэ-міністра МУСіА Яраслава Зялінскага.

Справа была таксама, кажуць, у праверцы... ведаў аб меншасцях упаўнаважаных ваяводы, якія займаюцца гэтай праблематыкай.

Міністэрскі ліст паступіў у тыя ваяводствы, у якіх пражываюць меншасці. У Падляшскай ваяводскай управе справай заняўся Лешак Калеснік, намеснік дырэктара аддзела грамадзянскіх спраў і чужаземцаў. У падпісаным ім лісце, які накіраваў каля трыццаці самаўрадам: маршалку ваяводства, прэзідэнтам Беластока і Сувалкаў ды бурмістрам, старостам, войтам (гмін, у якіх пражывае галоўным чынам беларуская меншасць), указаў: „Трэба прыняць пад увагу апрача даных аб выбарчых камітэтах зарэгістраваных арганізацыямі нацыянальных і этнічных меншасцей таксама даныя аб кандыдатах звязаных з асяроддзямі нацыянальных меншасцей, якія балатаваліся са спіскаў іншых выбарчых камітэтаў". Да суправаджальнага ліста прыклаў ён табель з сямі пунктаў, у якім дзве апошнія рубрыкі датычылі імёнаў, прозвішчаў і выконваных у самаўрадзе функцый прадстаўнікоў меншасці. Навошта такія інфармацыі ваяводу, а праз яго пасрэдніцтва МУСіА? Дырэктар Главацка-Мазур адказвае:

— Патрабуе гэтага справаздача, якую мы мусім накіраваць генеральнаму сакратару Савета Еўропы згодна 15 артыкулу Рамачнай канвенцыі Савета Еўропы аб Ахове нацыянальных меншасцей.

— Гэта проста шакіруе, — каментуе такія выказванні і патрабаванне МУСіА Ганна Махінская, кіраўнік Інфармацыйнага бюро Савета Еўропы ў Варшаве, адзінага прадстаўніка Савета ў Польшчы. — Я веру, што МУСіА мела добрыя намеры. Фактычна, СЕ патрабуе справаздачы, але не імён і прозвішчаў. Гэта не ў парадку.

І дадала:

— Мы звернемся ў МУСіА за тлумачэннямі.

Веслава Кастшэва-Зорбас, спецыялістка па справах інфармацыі з варшаўскага ІБ СЕ адзначае:

— Не патрабуюцца ніякія персанальныя даныя. Справа ў статыстычнай інфармацыі. Мне цяжка сказаць, чаму прагучала пытанне аб імёнах і прозвішчах.

Дзеля дакладнасці прыгадаем 15 артыкул Канвенцыі: „Бакі ствараюць умовы неабходныя для рэальнага ўдзелу асоб, якія належаць да нацыянальнай меншасці так у культурным, грамадскім і гаспадарчым жыцці, як і ў публічных справах, якія іх датычаць". Заглянулі мы і ў папярэдні рапарт-справаздачу. Вялікая тут ступень агульнасці. На практыцы, у адпаведнасці з яго зместам, ад мясцовых урадавых структур (ваяводаў) і МУСіА патрабуецца толькі агульная арыентацыя аб удзеле ў публічным жыцці, датычным меншасці. Вось прыклад змешчаных там заяў: „У самаўрадавых выбарах у 1990, 1994 і 1998 гг. уласныя спіскі выбарчых камітэтаў падалі меншасці: нямецкая, беларуская і ўкраінская. Такія камітэты ўзніклі на тэрыторыі Апольшчыны, Падляшша і ў Катавіцах. Частка асоб, якія належаць да беларусскай, літоўскай, славацкай і ўкраінскай меншасцей балатавалася са спіскаў камітэтаў паасобных партый, мясцовых выбарчых кааліцый або таксама як незалежныя кандыдаты". Калі справа датычыць 15 артыкула Рамачнай канвенцыі, у рапарце-справаздачы ні словам не ўспамінаюцца (бо ніхто гэтага не патрабаваў) даныя аб кандыдатах, звязаных з меншаснымі асяроддзямі, якія змагаліся за мандаты з іншых выбарчых камітэтаў, назваў камітэтаў, а тым больш імён і прозвішчаў.

PODLASKI URZĄD WOJEWÓDZKI w Białymstoku
15 213 Białystok, ul. Mickiewicza 12

WPŁYNĘŁO Sekretariat Dyrektora Generalnego
2007 -01- 29
Białystok, 26 stycznia 2007 r

OB.UK-J.0717-1/50/07

WPŁYNĘŁO Sekretariat Marszałka
2007 -01- 30

Według rozdzielnika
woj.podlaskie

Szanowni Państwo

Zwracam się z uprzejmą prośbą o przygotowanie i przesłanie do Wydziału Spraw Obywatelskich i Cudzoziemców Podlaskiego Urzędu Wojewódzkiego w Białymstoku informacji dotyczących udziału mniejszości narodowych i etnicznych w wyborach samorządowych przeprowadzonych w listopadzie 2006 r. Informacje proszę opracować wg. załączonych tabeli. Należy uwzględnić oprócz danych o Komitetach wyborczych zarejestrowanych przez organizacje mniejszości narodowych i etnicznych także dane o kandydatach związanych ze środowiskami mniejszości narodowych, ubiegających się o mandaty z list innych komitetów wyborczych.

Uprzejmie proszę o przekazanie wypełnionych tabeli wraz z ewentualnym opisem w terminie do dnia 2 lutego 2007 r. na adres ujakuc@bialystok.uw.gov.pl, bądź też faxem na numer 857439444

Адказы на ліст Лешка Калесніка і на просьбу МУСіА самаўрады мелі кіраваць на адрас Аддзела грамадзянскіх спраў і чужаземцаў. Мы даведаліся, што прадстаўнікі больш за дзесятка самаўрадаў адказалі на гэты загад. Большасць, аднак, не выявіла спрэчных даных.

— Я не разумею гэтых апасак, — здзіўляецца Анджэй Гаўкоўскі, дырэктар гэтага аддзела.

Бурмістр Кляшчэляў Аляксандр Сяліцкі сказаў:

— Як міністр можа патрабаваць інфармацый, якія законна засакрэчаны? Пераборшчылі! У нашай гміне меншасці стартавалі ад Беларуска-народнага выбарчага камітэта. І гэта я магу выявіць. У апошніх выпадках я магу толькі дадумоўвацца, хто якой нацыянальнасці.

На думку бурмістра Кляшчэль, справа мае палітычны характар і гэта не першы сігнал аб напружанасцях, якія стварае віцэ-міністр МУСіА Яраслаў Зялінскі ў дачыненні да беларускай меншасці:

— Калі міністр Зялінскі яшчэ раз будзе патрабаваць такую інфармацыю, дык наш адказ будзе такі самы. Усё гэта — звышстараннасць пана Зялінскага.

Намеснік прэзідэнта Беластока Аляксандр Сасна, адказны за грамадзянскія справы, кажа:

— Міністэрства ці прадстаўнікі ваяводы самі сабе пашырылі сферу зацікаўлення датычную гэтых спраў. У персанальных апытальніках таксама не інфармуем хто якой нацыянальнасці. Ніхто аб гэта ў нікога не пытаецца. Гэта індывідуальная справа кожнага чалавека. Хіба што хтосьці сам публічна прызнаецца да нацыянальнай ці канфесійнай прыналежнасці, так, як хоць бы і я.

Падляшскі маршалак Януш Кшыжэўскі сцвярджае:

— Тут адрасатам не павінны быць самаўрады, але, калі ўжо, дык хоць бы палітычныя партыі ці выбарчыя камітэты. Я афіцыйна ведаю, што ў выбарах у ваяводскі самаўрад стартаваў Беларускі выбарчы камітэт і толькі гэта ды лік кандыдатаў мы падалі ў адказе на ліст з ПВУ і МУСіА. Усё гэта — нязгоднае з прынцыпамі дэмакратычнай дзяржавы і здаровага розуму. Гэта яшчэ адзін прыклад недахопу кваліфікацый кіруючай каманды ў палітыцы ў дачыненні да меншасцей, у якой трэба дзейнічаць вельмі тонка.

Маршалкоўская ўправа не выявіла імёнаў, прозвішчаў і даных аб меншасных кандыдатах, якія балатаваліся са спіскаў іншых камітэтаў. Да тае ступені, што не ўспомніла ні лікаў, ні персанальнай інфармацыі аб чатырох агульнавядомых беларусах у падляшскім Сейміку (распушчаным пару дзён таму), м.інш. Яне Сычэўскім ці Яраславе Матвеюку з СЛД.

Самаўрадаўцы прызнаюцца амаль у адзін голас, што немагчыма, калі хтосьці сам гэтага публічна не дэкларуе — сцвердзіць нацыянальную прыналежнасць.

— Дык што, мне трэба было хадзіць па кабінетах і распытваць аб нацыянальнасць? Гэта ж нават па канстытуцыі прыватная справа кожнага, — кажуць.

Асабліва ў гэтым выпадку патрабаванне выяўлення імён і прозвішчаў кандыдатаў у самаўрадаўцаў і самаўрадаўцаў не толькі неадпаведнае, але і парушае закон аб ахове персанальных даных. Падпісаная пад адказам маршалка Кшыжэўскага генеральная дырэктар Маршалкоўскай управы Галіна Руткоўская адказвае адназначна:

— Гэта прымушанне нас да парушэння закону.

Прэс-інфарматар Галоўнага інспектара персанальных даных у Варшаве Малгажата Калужынская пасля нашых інфармацый і аналізу закону аб персанальных даных заявіла:

— Згодна Адміністрацыйнаму кодэксу будзем ад ПВУ і МУСіА патрабаваць тлумачэнняў, якія і ці ўвогуле былі падставы дамагацца такой інфармацыі.

Тым часам з інтэрпеляцыяй з сямю пытаннямі, накіраванай шэфу МУСіА Янушу Качмарку (непасрэдны начальнік Яраслава Зялінскага, а затым і ваяводы) звярнуўся дэпутат, шэф падляшскіх структур Грамадзянскай платформы Роберт Тышкевіч. Напісаў ён: „Многімі прадстаўнікамі нацыянальных і этнічных меншасцей быў ён [ліст — Р. С.] успрыняты як спроба стыгматызацыі нацыянальных і этнічных меншасцей".

Раней Яраслаў Зялінскі ў размове з адной з беластоцкіх газет заявіў:

— Меншасці залішне недаверлівыя. Мы хутчэй стараемся, каб даць, палегчыць, а не забраць. Хочам праверыць, наколькі выбарчы закон дае меншасцям шанц удзелу ва ўладзе.

Данута Главацка-Мазур у размове з „Нівай" сказала:

— Няма тут ніякай палітычанй падаплёкі. У іншых ваяводствах не было засцярог.

Справай пацікавілася м.інш. падляшская еўрадэпутатка Барбара Кудрыцкая:

— Ахова персанальных даных — адзін з найважнейшых еўрасаюзных стандартаў, якія маюць безагаворачна захоўвацца. Таму не ведаю, чаму гэта мае служыць — тое перадаванне інфармацыі, якая персанальна датычыць нацыянальнасці. Праз улік асоб, па прозвішчу і мясцовасці, можна ж атрымаць і іншую інфармацыю. Спроба атрымаць такія інфармацыі выходзіць па-за дырэктывы Савета Еўропы, які асабліва дбае пра свабоды і правы чалавека, м.інш. аб ахове персанальных даных. Можа, МУСіА хоча быць святейшым за святых? Можа, у сённяшнім разуменні патрыятызму справа ў інфармацыі хто ў Польшчы не адчувае сябе палякам? Тым не менш, можна паставіць пытанне: пад што ўсё гэта?

Прыгадайма 32 артыкул Канстытуцыі: „Усе роўныя па законе. Усе маюць права на роўнае трактаванне публічнымі ўладамі". „Ніхто не можа быць дыскрымінаваны ў публічным, грамадскім ці гаспадарчым жыцці з якой-небудзь прычыны". У сваю чаргу 4 арт. Рамачнай канвенцыі Савета Еўропы гучыць: „Бакі забавязваюцца асобам прыналежным да нацыянальных меншасцей гарантаваць права на роўнасць па законе і аднолькавую ахову законам. Любая дыскрымінацыя, якая вынікае з прыналежнасці да нацыянальнай меншасці, забаронена".

Камюніке пасля адной з апошніх дэбат Еўрапарламента: „ЕП у чарговы раз заклікаў Еўрапейскую камісію і ўрады членскіх дзяржаў да захоўвання асноўных правоў грамадзян ЕС у галіне аховы іх персанальных даных".

Раіна СТЭФАНЧУК

Бацькоўскі сход

10 лютага г.г. у Комплексе школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Бельску-Падляшскім адбыўся бацькоўскі сход I і II класаў гімназіі. Дырэктар Васіль Ляшчынскі прадставіў прысутным вынікі навукі паасобных класаў, зачытаў прозвішчы самых найлепшых вучняў і падзякаваў тым, хто рэпрэзентуе школу ў алімпіядах, спорце і займаецца ў музычных гуртках. Былі і менш вясёлыя тэмы як некарэктныя паводзіны вучняў і прагулы. Хаця пасада дырэктара цяжкая, то не пакідаў яго добры настрой, а і нам, бацькам, час прайшоў у мілай атмасферы.

На некалькі хвілін ад імя Рады бацькоў голас узяў нававыбраны яе старшыня Віктар Нікалаюк. Звярнуўся ён з гарачай просьбай да бацькоў, каб уносілі яны складчыны на Раду бацькоў. Дзякуючы гэтым грашам дзеці могуць карыстацца арганізаванымі ў акрузе мерапрыемствамі.

Пасля гэтага адбыліся сустрэчы бацькоў з выхавацелямі. Але найбольш мне і маім знаёмым спадабаліся дзяжурствы настаўнікаў, якія вучаць у I і II класах гімназіі. Адбываліся яны пры століках на калідоры школы. Бацькі мелі добрую нагоду пагутарыць на тэму сваіх дзяцей з настаўнікамі выбраных прадметаў. Да некаторых настаўнікаў выстраілася вялікая чарга. Быў вечар, субота, не трэба было выходзіць з працы і шукаць настаўнікаў па кабінетах. Трэба пахваліць аўтара гэтай ініцыятывы за добрую ідэю. Жадаю вучням поспехаў у навуцы, настаўнікам прыемнай працы і больш такіх бацькоўскіх сходаў.

Жэня МАРТЫНЮК

Прыярытэтнае пісьмо?

Мае ўнучка з унукам ды праўнучак выслалі мне з Гдыні, 18 студзеня г.г., віншаванні з нагоды Дня бабулі і дзядулі. Была гэта прыярытэтная пасылка, за якую яны заплацілі 2,10 зл. Ліст атрымаў я 25 студзеня.

Калісьці Пошта польская абяцала, што прыярытэтнае пісьмо даручыць адрасату на працягу 24 гадзін, нават на другі канец Польшчы. А тут выйшла так, што вышэйзгаданае пісьмо атрымаў я праз 7 сутак, значыць, праз... 168 гадзін. Тут відаць, што Польская пошта з'яўляецца вялікім манапалістам у нашай краіне, бо павышае кошты сваіх паслуг, але не спраўляецца з абавязкамі. На маю думку, антыманапольная ўправа павінна шырэй прыглядзецца працы нашай пошты, павінна прыняць якія-небудзь меры, каб выключыць гэтыя праблемы ды выбіць паштовым уладам з галавы гэтак званыя „прыярытэтныя пасылкі". Чаму ж пошта здзірае са сваіх кліентаў грошы, калі тэрмінова не спраўляецца са сваімі абавязкамі!

(мл)

Год з жыцця Белавежскага прыхода

Бурліць жыццё ў Праваслаўным прыходзе св. Мікалая ў Белавежы. Штогоду ў хроніку царквы запісваюцца новыя падзеі. А якім быў мінулы, 2006 год? Можна сказаць, што нядрэнны. Нягледзячы на фінансавыя цяжкасці, удалося рэалізаваць шмат важных інвестыцый і планаў.

www.bialowieza.cerkiew.pl

Бадай найвялікшым дасягненнем трэба палічыць рамонт цэннага помніка старадаўнасці — могільнікавай капліцы св.св. Кірылы і Мяфодзія ад 1873 года. Былі зменены дах і крыж на купале. Крыж ахвяраваў і сам яго выканаў Яраслаў Пэршка з Гайнаўкі. Капліца была ашаляваная звонку і ўнутры ды памаляваная. Устаўлены былі новыя вокны з кратай, пракладзены электраўстаноўка і громаадвод. Рамонт распачаўся напрыканцы ліпеня і працягваўся тры месяцы. Выканала яго фірма „Modern-Rem" з Беластока. Кошт рамонту склаў суму 140 тыс. зл. Звыш 80 працэнтаў ад гэтай сумы склалі датацыі Міністэрства культуры і нацыянальнай спадчыны, Касцельнага фонду, Сельскагаспадарчага фонду імя Рэйтана, а таксама ахвяраванні прыватных спонсараў і ўстаноў.

Крыху раней, у красавіку, закончыўся капітальны рамонт дому для вікарыя. Трэба тут дадаць, што новым белавежскім вікарыем з 18 чэрвеня 2006 г. з'яўляецца а. Валерыян Пятроўскі. Выконвае ён у прыходзе заадно абавязкі рэгента хору. Папярэдні псаломшчык Марцін Алексяюк перайшоў у Старакорнінскі прыход.

У красавіку прыход выдаў сваю пашыраную і папоўненую манаграфію, якую апрацаваў ніжэйпадпісаны. У наступным месяцы выйшла таксама серыя паштовак з выявай белавежскай царквы. Як цікавінку можна тут дадаць, што выява царквы св. Мікалая паявілася таксама на новых членскіх білетах Брацтва праваслаўнай моладзі ў Польшчы, якія пачалі абавязваць з пачаткам 2007 года.

23 ліпеня Белавежскі прыход займеў свой сайт **www.bialowieza.cerkiew.pl**, які карыстаецца вялікай папулярнасцю не толькі прыхаджан, але і ўсіх белавежцаў. На сайце можна знайсці інфармацыю пра навейшыя падзеі не толькі ў жыцці прыхода, але і ўсёй Белавежы. За сайтам паспяхова даглядае Міхал Корх, сын настаяцеля прыхода.

У жыцці Белавежскага прыхода сваю прысутнасць выразна зазначае маладзёжны хор. У маі заняў ён трэцяе месца на Міжнародным фестывалі „Гайнаўскія дні царкоўнай музыкі". Даў ён таксама канцэрт удзельнікам XII Міжнароднага сімпозіума Мікалагічнай секцыі Польскага дэрматалагічнага таварыства ды прыняў удзел у студзеньскіх экуменічных сустрэчах, арганізаваных у Белавежскім асяродку культуры. У кастрычніку хор запісаў некалькі твораў для перадачы „Тэлебачанне рэгіёнаў" на 3-й праграме Польскага ТБ.

Сваіх поспехаў дабіваюцца і паасобныя маладыя прыхаджане. Вось, напрыклад, Мірон Марчук заняў першае месца ў катэгорыі „пачатковыя школы" на X турніры чытання царкоўнаславянскіх тэкстаў. На гэтым жа самым турніры, у катэгорыі „гімназіі", перамогу атрымаў Кшыштаф Кудэрскі.

Прыход пры падтрымцы Еўрапейскага Саюза і пад патранатам Еўрарэгіёна „Белавежская пушча" рэалізаваў праект „Свет і Стваральнік вакол нас". У ліпені ў белавежскім Асяродку праваслаўнай моладзі ў Польшчы адбыўся лагер, у якім удзельнічала моладзь з Белавежы і ваколіц, а таксама з праваслаўнага прыхода ў Свіслачы (Беларусь). Галоўнай прадпасылкай праекта было супрацоўніцтва моладзі рэгіёна Белавежскай пушчы. Адным з элементаў польска-беларускага абмену стаў праект веласіпеднага і пешага турысцкіх шляхоў, які распрацавалі Агата Скепка і Анна Вашкевіч. Шляхі названы „Па слядах белавежскіх веравызнанняў" і праходзяць яны цераз усе месцы культу на тэрыторыі Белавежскай гміны.

У жніўні больш за 60 прыхаджан прыняло ўдзел у III Белавежскім паломніцтве на Святую Гару Грабарку. Апрача таго прыход арганізаваў аўтобусныя паломніцтвы ў іншыя праваслаўныя месцы культу ў Польшчы і па-за яе межамі.

Улетку Белавежскі прыход прыступіў да конкурсу на найлепш утрыманы помнік старадаўнасці драўлянага будаўніцтва Падляшскага ваяводства і заняў другое месца, атрымаўшы ва ўзнагароду 2 тыс. зл.

Варта адзначыць, што ў мінулым годзе аж двум белавежскім прыхаджанам споўнілася 100 гадоў жыцця. Свае юбілеі адсвяткавалі Надзея Руско (27 студзеня) і Юліян Байко (23 верасня).

А якія планы Белавежскага прыхода на бягучы год? Настаяцель прыхода а. Сяргей Корх хоча, перш за ўсё, правесці капітальны рамонт званіцы ў мураванай царкве. Будуць у ёй зменены вокны, падлога і тынк. Праектуецца таксама пракладка асвятлення на галоўнай алеі могільніка. Калі знойдуцца грошы, будуць праведзены працы па рэстаўрацыі старой іконы „Пакроў Божай Маці", якая знаходзіцца ў капліцы св.св. Кірылы і Мяфодзія. Прыхадскі савет прадбачвае на гэты год яшчэ распрацоўку праекта насценных фрэскаў у галоўным храме. Такія фрэскі ў белавежскай царкве існавалі да вайны, але былі знішчаны 1 верасня 1939 г., калі немцы скінулі на царкву дзве бомбы.

Ужо ў лютым г.г. пачаліся працы пры пабудове, за ўваходнымі варотамі на царкоўную плошчу, домік, у якім будзе прадавацца тавар рэлігійнага характару.

Пётр БАЙКО

Нетыповыя назвы

У сваіх летніх, ужо некалькігадовых веласіпедных вандроўках, не толькі па белавежска-пушчанскіх, але і па насамперш махнацкіх, потым стараберазоўскіх ці збуцкіх сцежках ды дарожках, прыгадвалася мне думка, каб запісаць назвы ўрочышчаў. Не паспеў. Затое Грыша Мароз („Ніва" ад 4.02.2007 г.), першы пералічыў назвы ўсіх палетка, якія акружаюць з усіх бакоў Стараберазова, каб не загінулі.

Тое, што палі Стараберазова маюць квадратную форму, то, па-мойму, не справа спагадлівага жыхарам вёскі землямера, ці хабарніцтва стараберазаўлян, але пэўна таму, што калі размералі зямлю дубічам, збуцкім, махначам, то дзесьці трэба было пасяліць стараберазаўлян, якія ці не жылі дзесьці за Сямівалокамі, дзе маюць свае сенажаці. І так ужо шчасліва для іх здарылася, што з участкаў, адрэзаных ад суседніх вёсак, выйшаў зусім удалы квадрат.

Пытае Грыша Мароз: «Да чаго можа пасаваць „Брытан" ці „Катэлец"?» Зацікавілі і мяне гэтыя, як не кажы, нетыповыя назвы. Глянуў я ў сусветную сетку інфармацыі. Фактычна, на слова „Брытан" Інтэрнэт у няцэлую секунду выкінуў 38 тысяч старонак з гэтым словам. Чаго тут няма. Такой назвай карыстаецца і транспартная фірма, і часопіс аб альпінізме, і піла, якая належыць да саставу агульнабудаўнічых піл універсальнага прымянення. Аднак найбольш старонак датычыць сабак, якія называюцца „Брытан". Немагчыма было пераглянуць некалькі дзесяткаў тысяч старонак, каб знайсці тую адпаведную для палетка назву „Брытан".

А можа нейкі вялікі сабака „Брытан" некалі на тым палетку кагось там пакусаў і так ужо асталося?

„Катэлец" выступае толькі на 38 сайтах, сярод якіх ніводнай польскай старонкі. Ёсць тунель „Катэлец", дзесьці ў Катніку. Ці то не ў Славеніі? Мо калісь нейкія славенцы жылі каля цяперашняга Стараберазова, а потым перабраліся, так як перабраліся новаберазоўцы, якія ўжо не маглі памясціцца на „Катэльцу", і выехалі ў Славенію. Каб нехта вывучыў ДНК стараберазоўцаў і славенцаў, мелі б мы адказ на пытанне ці фактычна так было.

Міхась КУПТЭЛЬ

Дзед Мароз і фабрыка самагонкі

— 2 —

У рэстаране „Камянюкі” гадзіннік ідзе паводле маскоўскага часу. Ён яшчэ і спазняецца на дзесяць хвілін, і ў мяне з'яўляецца смешная думка. Беларусь еўрапеізуецца „ад заду” — цераз Маскву. Найбольш, за справай расійскага тэлебачання...

Масквічы частыя госці ў Белавежскай пушчы. Расіяне любяць сустракаць тут Новы год. Найбольш культавая гасцініца знаходзіцца ў Віскулях, у гістарычным месцы, дзе ў 1991 годзе быў падпісаны дагавор аб ліквідацыі Савецкага Саюза. Завітаем туды яшчэ сёння ў гэтае месца, цікавае таксама з-за паляўнічых прыгод Леаніда Брэжнева.

У рэстаране пакуль пуста, беларускія і змежныя турысты з'едуцца ў канцы тыдня. Сяджу са спадарынямі Таісай і Аняй за сталом накрытым прыгожым ільняным абрусам. На абед прапануюць нам салат „Мечта лесника” (падаюць яго ў шкляной чарцы), фасолевы суп, рулет з кураціны з начынкай з жоўтага сыру, сасмажаны ў глыбокім тлушчы, густы журавінавы сок — апошні рарытэт гэта любімы напой Снягурачкі, казачнай прыгажуні ў Памесці беларускага Дзеда Мароза. Такі састаў, разам з кавай, каштуе 12 долараў (36 злотых). Меню рэстарана багатае ў стравы з дзічыны: (мяса з дзікага кабана, аленя, дзікай качкі), з грыбоў і беларускіх народных прысмакаў. На першым месцы тут дранікі і аладкі, бліны з мёдам, сочывам і сырам. Стравы са свежай і вэнджанай свініны, ёсць розныя віды рыбы і прыстойны выбар халодных закусак.

Добры смак можа папсаваць адно збянтэжаны выгляд у афіцыянта, калі загаворыце да яго на беларускай мове.

Мой рэстаран знаходзіцца ў турыстычным ансамблі, канкрэтна ў „Гостинице н-р 1”, у гэтым будынку аж два рэстараны, іх узровень вызначаецца на тры зоркі.

* * *

У Белавежскую пушчу даволі складана дабрацца з беларускага боку прыватным шляхам. Калі на аўтавакзале ў Брэсце я хацела набыць білет у Камянюкі, у касе патрабавалі пашпарт.

У мяне была ўжо прапіска, таму я магла спакойна вярнуцца. Без пячаткі, практычна, у мяне не было б шанцаў вярнуцца, нават калі б там, у гасцініцы, я пакінула свой багаж. Найлепш, калі справай прапіскі займецца адміністрацыя гасцініцы. У адваротным выпадку замежны турыст патраціць многа часу і столькі ж нерваў. Я мела шчасце, дапамагла мне сяброўка-журналістка Таіса. Разам мы запісалі тону паперы, у тым ліку запоўнілі фармуляр, у якім пыталі між іншым: „Когда вы последний раз были в СССР?”. Гэтае пытанне, пасля пабыўкі ў Віскулях, гучыць проста вампірычна!

Каб аформіць прапіску, мы спецыяльна паехалі ў раённы цэнтр, у Камянец. А як прыемна было вяртацца ў пушчу.

Памятаю, як тры гады назад, я магла адно паглядзець на яе з Белай Вежы ў гэтым самым Камянцы. У запаветную зону беларускі таксіст тады не хацеў ехаць: — *Там жа ж шлагбаумы! Нас адразу завернуць ды яшэ штраф улепяць!*

„Гасцінны дом” ва ўрочышчы Перароў

Адмаўляў і гродзенскі сябра, які стаў палохаць дарагоўляй. Цана нумара ў Віскулях, паводле яго, мела каштаваць касмічныя 200 долараў; там мелі адпачываць адно „новыя рускія” (гэта вядома, мізэрныя грошы для „новых рускіх”, якія ў гасцініцы „ODESSA” (у Адэсе) знімаюць нумар за 1 100 $ у суткі).

Папраўдзе, турыстычныя паслугі па беларускім баку ў Белавежскай пушчы даступныя грамадзянам РБ. У тураддзеле інфармуюць мяне, што сярод гасцей, аднак, найбольш жыхароў Мінска, а не Масквы. Месца палюбілі таксама ўкраінцы і немцы.

Спачатку наведваю „Гасцінны дом” ва ўрочышчы Перароў. Драўляны дом мае простае, практычнае абсталяванне і, мабыць, таму ўпадабалі яго паляўнічыя. У ім пяць месцаў. За суткі (за пяць асоб) патрабуюць 180 000 беларускіх рублёў — гэта прыблізна 90 долараў (па 18 долараў ад душы). Дом стаіць у пушчы ля царскай дарогі. Праз яго вокны можна сачыць за дзікімі кабанамі, якія падыходзяць пад агароджу пасады. Увага: неабходнае браніраванне (заказ рабіць у тураддзеле па тэлефоне: (01631)-5-62-42; факс (01631)-2-50-56, э-мэйл: <box@npbprom.bielpark.brest.by>; патрабуецца 30% належнасці за нумар у суткі.

* * *

Пушчанская вёсачка Лядская, вядомая ўжо ў часы караля Жыгімонта Аўгуста, выглядае як новая. На старыя сцены пакладзены новы шалюнак з дзерава, усярэдзіне вядзецца рамонт. Каб было выгадна і пасучаснаму.

— У нас ідзе новае засяленне вёсак, — кажа Мікалай Бамбіза. — Пушчанская моладзь паўцякала ў гарады. Ёсць многа пустых хатак. На гэтае месца мы хочам пасяліць лясных работнікаў, якія з'язджаюцца з усёй Беларусі.

Дырэктар Бамбіза родам ад старажытнага Турава, раней кіраваў Прыпяцкім нацыянальным паркам. Цяперашні яго дом стаіць у пушчанскай вёсцы Падбельскія-Агароднікі. Гэта пятнаццаць кіламетраў ад сядзібы Парку, дзе яго кабінет і прадпрыемства.

Наша Семяноўскае вадасховішча мае сваю старэйшую сястру на беларускім баку. Непадалёк вёскі Лядская знаходзіцца штучны вадаём — возера Лядское.

Пабудавалі яго 1960-я гады на балоце Лядо і багонным цёку Перавалока.

— Каб была ў пушчы вадаплаўная птушка, — адкрывае адну тайну Анна Семакова, навуковы супрацоўнік і аўтар займальных аповедаў пра Пушчу, — спачатку дзікія птушкі разводзілі штучным метадам.

Аня паказвае нам жоўты домік на беразе возера, дзе гадавалі дзікіх качанят. Раней, тутэйшыя вяскоўцы бродзілі па балоце і выбіралі з гнёздаў яйкі ў дзікіх качак. Везлі іх пасля ў Пружаны і выводзілі іх там пад інкубатарам. Пасля качанят зноў прывозілі на бераг возера, і, падгадаваўшы ў вальерах, выпускалі на волю...

Качак разводзілі з канкрэтнай мэтай. На іх любілі паляваць рэзідэнты Крамля і іх госці...

(працяг будзе)

Тэкст і фота Ганны КАНДРАЦЮК

Пушчанская вёсачка Лядская — на старыя сцены пакладзены новы шалюнак з дзерава, усярэдзіне вядзецца рамонт

Я — супраць!

У час парламенцкай дэбаты над сёлетнім бюджэтам шмат рознагалосся выклікала сенацкая папраўка, якая тычылася адвядзення сарака мільёнаў злотых з пенсіённага фонду ЗУС на будову храма Наканавання Божага. Праект закону прад'явіў міністр культуры і нацыянальнай спадчыны Казімеж Міхал Уяздоўскі. Праект падтрымала кіруючая кааліцыя, супраць выказаўся Саюз левых дэмакратаў. „Гэта незаконна, каб грошы падаткаплацельшчыкаў прызначаць на будову храма, — гаварыла дэпутатка СЛД Іаанна Сэнышын. — Сакральныя аб'екты павінны будавацца на сродкі вернікаў”. У адказ аўтар прапановы канстатаваў: „Калі можам прызначыць два мільёны злотых на праваслаўны манастыр у Супраслі, за што так змагаўся дэпутат Яўген Чыквін, дык чаму не можам прызначыць на храм у Варшаве? Гэта ж таксама будзе помнік нацыянальнай культуры і абавязкам грамадскасці падтрымаць гэтую мэту”. Дэпутатка Сэнышын была іншай думкі. „Манастыр у Супраслі, — аргументавала, — быў пабудаваны некалькі стагоддзяў таму і лічыцца помнікам даўніны, а храм Наканавання Божага яшчэ не збудаваны”.

Вось і ў тым праблема. Варта адзначыць, што на пабудову храма ўжо ў мінулым годзе было прызначаных дваццаць мільёнаў злотых, якія дагэтуль не выкарыстаны. Сёлета з дзяржаўнай касы будзе адведзена чарговых сорак. Разам, значыць, шэсцьдзесят мільёнаў. Гаворым, што няма грошай на лячэнне хворых, што расце задоўжанасць шпіталяў. Каб трапіць на кансультацыю да лекара-спецыяліста, трэба некалькі месяцаў чакаць у чарзе. Аб правядзенні спецыялістычнай аперацыі лепш не гаварыць. У Польшчы пражываюць грамадзяне розных культур і нацый. У кожнай сваё веравызнанне. Парламентарыі, памойму, не маюць права прызначаць грошай з дзяржаўнай касы на канфесійныя мэты. Я супраць такой ідэі!

Уладзімір СІДАРУК

Новыя асяродкі

У мінулым годзе шмат што зрабіў самаўрад Нараўчанскай гміны ў Гайнаўскім павеце. Прыстасавалі мураваны будынак былой школы ў Семяноўцы для патрэб Асяродка экалагічнай адукацыі ды прыгожы стогадовы драўляны будынак былой школы ў Нараўцы — на Галерэю імя Тамары Саланевіч. Апрача гэтага адрамантавалі святліцы ў Гушчэвіне, Міклашэве і Міхнаўцы.

Асяродак экалагічнай адукацыі ў Семяноўцы забяспечылі мэбляй і іншым неабходным аснашчэннем. Інвестыцыя каштавала 1 млн 620 тысяч злотых. Тут ужо адбываюцца заняткі ў рамках „зялёнай школы” для школьнай моладзі і студэнтаў, курсы, канферэнцыі, семінары і інш.

Сёлета будзе адноўлена ды багата забяспечана музычнымі інструментамі і касцюмамі для хору „Цаглінкі” самаўрадавая святліца ў Старым Ляўкове.

(мох)

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка

для дзяцей і моладзі

СПАБОРНІЧАЛІ І ГУЛЯЛІ

У час развівання моткаў дзеткі выказаліся вялікай хуткасцю і спрытам

У Падставовай школе н-р 6 у Гайнаўцы беларускія мерапрыемствы ладзяцца здаўна, але колькасць вучняў, якія прымалі ў іх удзел, была абмежаванай. У канцы „Масленіцы" (16 лютага) настаўнікі беларускай мовы з дапамогай іншых педагогаў арганізавалі для ўсіх вучняў IV-VI класаў беларускае святкаванне пад лозунгам „Кошык весялосці на сваім падвор'і". З дапамогай прыйшлі ім бацькі, гімназісты і людзі культуры. Прыбылі ў школу таксама народныя творцы, якія паказвалі забытыя ўжо рамёствы. У Комплексе школ н-р 3, у саставе якога знаходзіцца гайнаўская „шасцёрка", прыблізна трэцяя частка вучняў ходзіць на заняткі беларускай мовы. Спаборніцтвы і народныя гульні ды спяванне беларускіх песень былі добрай нагодай, каб заахвоціць новых вучняў да вывучэння роднай мовы.

Спачатку з багатым рэпертуарам выступілі перад вучнямі дзяўчаты з калектыву „Знічка" з Гайнаўскага белліцэя. Дзеткі гучна апладзіравалі і, заахвочаныя настаўнікамі, сталі махаць ручкамі пад меладычныя песні. Цешыць, што яшчэ частка гайнаўскіх вучняў умее гаварыць пасвойму і не саромеецца роднай мовы. Перад школьнымі сябрамі на гаворцы ўдала выступілі старэйшыя дзяўчаты з дыялогамі з вясковага панадворка. Да музычнага настрою вярнулі вучняў беларускія песні ў выкананні школьнага калектыву гіп-гоп, але хутка трэба было рыхтавацца да спаборніцтваў, якія праводзіліся згодна народным традыцыям.

У час спеваў хлопцы гучна апладзіравалі

Беларускі турнір спадабаўся вучням, бо ў ходзе яго можна было выкарыстаць спартыўныя, мастацкія і іншыя ўмеласці. Дзеткам трэба было выканаць выцінанкі і ў гэтым спаборніцтве найлепш справіліся дзяўчаты. Хлопцы паказалі свае ўмеласці як скакуны, перамяшчаючыся ў мяшках. Вучні мусілі трэніравацца перад турнірам у развіванні нітак з моткаў і навіванні іх на клубок, бо ў час турнірных змаганняў добра спраўляліся з гэтай задачай. Зразумела, што спецыялістамі па пляценні касы ў мінулым былі дзяўчаты. Зараз усё памянялася і коратка падстрыжаным дзяўчаткам трэба вучыцца пляценню касы так як і хлопцам. У турніры складанымі былі пачаткі, але пасля пляценне касы з ільну набрала тэмпаў. Час быў менш важны ў ігры называнай „каменьчыкамі", але патрэбны быў спрыт у руках. Вучні мусілі ўмела лавіць падкінутыя каменьчыкі, што асабліва падабалася хлопцам. Хлопцы таксама больш ахвотна качалі абручы і пілі малако цераз саломку. Калі турнірная камісія падвяла вынікі спаборніцтваў, аказалася, што сярод чацвёртакласнікаў пераможцамі турніру сталі дзеткі IV „а" класа, а з ліку старэйшых вучняў перамаглі дзеткі з V „а" і VI „ц" класаў.

— У час нашага святкавання вучні маюць магчымасць многаму навучыцца і пагуляць, — заявіла настаўніца беларускай мовы Людміла Грыгарук, якая была ініцыятарам мерапрыемства. — Зараз адбываецца інтэграцыя вучняў і настаўнікаў. Можа пасля спаборніцтваў новыя вучні прыйдуць на заняткі беларускай мовы.

Арганізатары святкавання (справа) Людміла Грыгарук, Беата Кендысь і Гражына Паўлючук

У час турніру і пасля яго заканчэння вучні маглі паглядзець варштаты працы народных творцаў. Некаторыя дзеткі моцна цікавіліся даўнімі заняткамі і патрабавалі, каб ім дакладна тлумачылі як працавалася ў мінулым. Марыя Нічыпарук з Грабаўца выконвала кветкі з каляровай бібулы і можа таму вакол яе часцей гуртаваліся дзяўчаты, якія

ТВОРЧАСЦЬ ГІМНАЗІСТАЎ

Муха ціп-топ!

— 19 —

Пра Свята закаханых забываюць ужо на другі дзень, але ў нашай школе было ішакш. Тыдзень пасля „Валянцінак” у нас адбыўся дэкламатарскі конкурс, дзе вучні выступалі з вершамі пра каханне. Праўда, пачаткова ён меў адбыцца 14 лютага, але ў той час захварэла галоўная арганізатарка, спадарыня Шум і конкурс адтэрмінавалі. Спачатку я не хацела прымаць у ім удзелу, але спадарыня Шум сказала, што кожны ўдзельнік атрымае шасцёрку па польскай мове.

Як не цяжка дадумацца, ахвотных было хоць адбаўляй! З нашага класа ўсе як адзін прыступілі да конкурсу, нават Міколка. Гэты апошні ніколі раней не ангажаваўся ў такія справы, наадварот, ён толькі высмейваў усе школьныя конкурсы і тэатры. Дражніўся на перапынках, хіхікаў, празываў няўдалых „акцёраў”. Гэта з-за яго многім адхацелася ісці ў „акцёры” (няма як добрая порцыя крытыкі!).

У гэты раз, калі Міколка заявіў сваю прысутнасць, мы сталі рагатаць, бо ўсе спадзяваліся, што ён прыдумае нейкае „шоу”...

Так ці інакш, хвароба спадарыні Шум астудзіла наш запал і спадзяванні. Многія ўвогуле забыліся пра конкурс. Прыгадалі пра яго ў дзень, калі настаўніца вярнулася ў школу і ад рання, разам з трэцякласнікамі, сталі рыхтаваць святліцу да мерапрыемства.

Мы таксама сталі рыхтавацца. Большасць з нас толькі сёння ўспомніла пра конкурс і пачала „дзейнічаць”. Я, Ганка, Соня, Кася, Міколка, Ігар, Сяргей і Матвейка паперлі на першым перапынку ў бібліятэку. Мы хапалі з паліцы выпадковыя вершы і глядзелі ці выступае ў іх слова „каханне”...

— Лепш скажыце сваю любімую песню вершам, — параіла Аўрэлія, якая таксама была ў бібліятэцы.

Гэтая ідэя мне спадабалася і я на ўроку хіміі, замест думаць пра прадмет і задачы, прыгадвала сабе песню пра каханне... Аднак паказалася, што я не ведаю ніводнай такой песні. Тыя ўсе, якія мы часам спяваем з дзяўчатамі на перапынку, былі пра... Менавіта — пра што яны? Я думала і не магла нічога прыдумаць. Ганка таксама „змагалася”, яна зубрыла нейкі верш з падручніка па літаратуры, які выпадкова ёй адкрыўся і не быў доўгі. Міколка шмараваў нейкія кветкі і сэрцайкі на лістку паперы і я падумала, што ён сучасны „паэт”. Пад уплывам гэтай смешнай сцэны я ўлавіла ідэю... Так, я ведала ўжо як мне выступіць на сцэне...

У дзень конкурсу, здавалася, у нашай школе былі адны кандыдаты ў „акцёры” і дыктары. Да конкурсу прыступіла аж 90 асоб з другіх класаў. Прыблізна столькі ж ахвотных было і ў іншых класах. Каб хутчэй праслухаць усіх удзельнікаў, нас раздзялілі на шэсць груп ды размясцілі ў розныя класы. Я папала ў самую прэстыжную групу. Нас ацэньвала журы ў саставе: спадарыня Воўк, наша Аўрэлія і акцёр гарадскога тэатра, спадар Кропка. Гэты апошні наводзіў вялікі канфуз, калі гімназісты кляпалі свае вершы, ён або смяяўся ўголас або дэманстратыўна пазяхаў. Некаторыя ўвогуле не выступілі, у тым ліку наш Міколка, з якога мы мелі ахвоту пасмяяцца.

Я выступіла апошняй... У час маёй дэкламацыі нават запанавала цішыня, і я адчувала, што ўсё ідзе як найлепш... І сапраўды, я апынулася сярод лаўрэатаў. Аднак камісія не ведала каму прызначыць першае месца — мне ці маёй сяброўцы Соні. Члены камісіі папрасілі нас яшчэ раз прадэкламаваць свае вершы. Соня, вядома, прадэкламавала...

Я не магла паўтарыць свайго верша, бо гэта была мая аўтарская імправізацыя (якой я на хаду прыдумала аўтара і цяпер не патрапіла паўтарыць яго прозвішча.) І хоць спадар Кропка назваў мяне „Мухай ціп-топ”, Воўк прапанавала дысквалiфікаваць мяне.

— Гэта нязгодна прынцыпам конкурсу, — у дырэктаркі склалася прыкрае ўражанне ад майго творчага палёту і яна патрабавала ўляпіць мне адзінку. На шчасце спадарыня Шум даказала, што арганізатары не прадбачылі кары дэкламатарам!

Тэкст:<natasza9922@wp.pl>
Дызайн:<lolcia05@wp.pl>

Вершы Віктара Шведа

Сустрэлася двух Янкаў

На аўтобусным паўстанку
Сустрэлася двух сябраў-Янкаў.
Адзін азваўся зухавата:
— Ці ты, дружа мой, жанаты?

— Яшчэ не. Ды разважаю.
— А навошта ты чакаеш?
Янка адказаў са злобай:
— Я чакаю самахода.

Славуты 29 люты

Запыталіся Колькі:
— Табе гадоў колькі?
— Я надта малады,
Мне толькі тры гады.

— Ці не лепш прызнацца,
Што табе дванаццаць?
— У мяне ж славуты
Дваццаць дзевяты люты.

любяць займацца рукадзеллем. Яніна Ефімюк з Чаромхі вучыла саломапляценню. Побач яе было многа саламяных вырабаў — куфэркі, каробкі і розныя кошычкі, якімі таксама перш за ўсё цікавіліся дзяўчаткі. Хлопцы затое наведалі варштат працы Міраслава Несцерука з Гайнаўкі, які паказваў, як рабіць кармушкі і іншыя драўляныя вырабы. Людміла Карпюк з Дубіч-Асочных паказала прыгожа аздобленыя велікодныя яйкі, рознай велічыні каралікі і сурвэткі.

Пасля спаборніцтваў з дзеткамі спаткалася Анна Фіёнік са Студзіводскага музея малой айчыны і стала вучыць іх народнай песні. Каб лягчэй ішла адукацыя, спалучыла яна спяванне з простымі крокамі народных танцаў.

У час беларускага свята адбылося таксама падвядзенне вынікаў мастацкага конкурсу „Мая малая айчына”. Першыя месцы занялі **Эмілія Галёнка** і **Агата Пятрочук**, на другім месцы апынуліся **Вераніка Салкевіч** і **Дыяна Федарук**, а трэцяе месца занялі **Магдаліна Дарашук**, **Магдаліна Леанчук** і **Ілона Федарук**. — Вучні пастэльнымі фарбамі найчасцей малявалі краявіды вёсак сваіх бабуляў. На працах віднеюць старэнькія хаткі, красуюцца Белавежская пушча і лугі. Дзеткі ўмелі заўважыць цудоўныя месцы нашай малой айчыны і добра было б, каб вярталіся да іх не толькі ва ўспамінах, — гаворыць настаўніца беларускай мовы Беата Кендысь.

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

Польска-беларуская крыжаванка № 9



Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку”. Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку н-р 5: Бліны, клас, ас, рад, машынка, тачылка, малы, за, Агата, пачатак, крок, рыса. Парк, лёс, мама, пачатак, шыла, крылы, ар, бланк, ты, адказ, Ас, ас, арка.

Узнагароды, **запісныя кніжкі**, выйгралі: **Паўліна Башун, Аня Анікіюк, Кася Саковіч, Аня Каліноўская, Дыяна Капытка, Наталля Янцэвіч** з Чыжоў, **Рафал Скепка, Матэвуш Лапінскі** з Дубін, **Магда Сахарчук** з Бельска-Падляшскага. Віншуем!

Пра Багдановіча і трактары ў Гайнаўцы

У прысутнасці паслоў Беларусі, Азербайджана, Арменіі, Казахстана і Малдовы 17 лютага ў Музеі і асяродку беларускай культуры ў Гайнаўцы адбылося адкрыццё выстаўкі „Пясняр чыстай красы", прысвечанай творчаму і жыццёваму шляху класіка беларускай літаратуры Максіма Багдановіча. Дыпламаты такога рангу наведвалі раней Гайнаўку толькі пры нагодзе Міжнароднага фестывалю царкоўнай музыкі. Цяпер гасцямі хутка заапекаваліся самаўрадаўцы, а мясцовыя прадпрымальнікі выявілі ахвоту сустрэцца з імі. Можа таму пасля афіцыйнага адкрыцця выстаўкі, у час якога дзяўчаты са „Знічкі" захапілі сабраных сваім прыгожым спевам, дыпламаты і іншыя важныя госці хутка пакінулі выставачную залу, каб паспець на чарговыя спатканні. Сярод прыгожых карцін, прысвечаных вялікаму беларускаму песняру Максіму Багдановічу, копіяў ягоных рукапісаў і старых здымкаў найдаўжэй засталіся любіцелі яго творчасці — людзі культуры, настаўнікі белліцэя, вучні і старэйшыя людзі. На пытанні сабраных адказвалі Таццяна Шэляговіч — дырэктар Літаратурнага музея Максіма Багдановіча ў Мінску і вучоны сакратар гэтага ж музея Ірына Мышкавец, якая вельмі падрабязна расказвала пра ўсе экспанаты.

Пра выстаўку расказвалі (справа) вучоны сакратар Ірына Мышкавец і дырэктар Таццяна Шэляговіч

— Максім Багдановіч быў маладым пісьменнікам і юным чытачам даваў прыклад як жыць. Яго творчасць была зразумелая маладому пакаленню і разумее яе таксама сённяшняя моладзь. Багдановіч прысвяціў сваё кароткае жыццё служэнню дабру Бацькаўшчыны і вучыў іншых так жыць, — заявіла дырэктар Таццяна Шэляговіч. — Калі паглядзець даўжэй на прывезеныя намі экспанаты, можна ўявіць сабе свет, у якім Багдановіч жыў і ствараў цудоўную паэзію.

Таццяна Шэляговіч паінфармавала, што асабістых рэчаў паэта захавалася мала. Губляліся яны пры нагодзе частых змен месцажыхарства пісьменніка і ў час ваенных падзей. Музей Максіма Багдановіча ўзнік толькі ў 1991 годзе і таму ён вельмі бедны ў асабістыя прадметы паэта. Затое ён цікава запраектаваны і абсталяваны. Багатая экспазіцыя дазваляе падрабязна знаёміцца з жыццём і творчасцю пісьменніка.

— Мастацкія карціны, прывезеныя ў Гайнаўку, былі напісаны нашымі лепшымі мастакамі на спецыяльны конкурс і знаходзяцца ў саставе экспанатаў выязных выставак. Яны ў нашым музеі не паказваюцца, — сказала дырэктар Таццяна Шэляговіч. — На працах паказаны месцы, дзе жыў і пісаў Максім Багдановіч. Бачым мы Мінск, Ніжні Ноўгарад, Яраслаўль, Ялту.

Самыя важныя моманты з жыцця і творчасці Багдановіча прадстаўлены таксама на паштоўках і копіях архіўных здымкаў. Можна пабачыць таксама копіі рукапісаў паэта і габелены, выкананыя мастакамі да яго твораў. Пра ўсе экспанаты деталёва распавяла вучоны сакратар Ірына Мышкавец, якую шчыльна акружыла група найбольш зацікаўленых выставай гайнавян. Іншыя наведвальнікі, самастойна абышоўшы выстаўку, гутарылі ў невялікіх кампаніях. Я запытаў наведвальнікаў пра ўражанні ад выстаўкі.

— Для мяне Максім Багдановіч гэта перш за ўсё дасканалы лірык і шкада, што ён памёр на туберкулёз у так маладым узросце. Перад ім была ж вялікая будучыня. Ён быў адным з першых пісьменнікаў, які сваю творчасць, што вылучалася наватарствам і эстэтызмам, накіроўваў да беларускай інтэлігенцыі. У Савецкай Беларусі яго творчасць спіхвалася на абочыну, а яго творы не траплялі ў школьныя падручнікі. У дзевяностых гадах пайшла адмена і тады стала друкавацца яго творчасць. Зараз у Беларусі пайшла стаўка на рускую мову і Багдановіч зноў для некаторых становіцца непатрэбным пісьменнікам, — заявіў Віктар Швед і прачытаў у час мерапрыемства свой верш, прысвечаны Максіму Багдановічу.

— Мяне найбольш узрушае верш „Зорка Венера", які кранае за сэрца. Іншым творам Максіма Багдановіча таксама характэрная вялікая чуллівасць. Для нас, маладых людзей, яго творчасць зразумелая і цікавая, — кажа вучаніца Гайнаўскага белліцэя Маргарыта Кулік і дадае, што варта ўсім вучням яе школы наведаць выстаўку. Яе сяброўка таксама хваліць прывезеную з Мінска экспазіцыю.

— Мне найбольш падабаюцца мастацкія карціны, якія заахвочваюць да чытання твораў Максіма Багдановіча, — гаворыць белліцэістка.

Настаўніца беларускай мовы з Гайнаўскага белліцэя Вольга Сянкевіч заяўляе, што моладзь з яе школы любіць чытаць вершы Максіма Багдановіча.

— „Пагоня", „Дзве таполі", „Зорка Венера", „Апокрыф" — гэта вершы, якія нашым вучням падабаюцца найбольш, — кажа Вольга Сянкевіч. — Ліцэістаў цікавяць тэмы, якія закранае Багдановіч, з-за іх таямнічасці. Трэба чытаць яго творчасць, каб палюбіць беларускую літаратуру.

Гайнаўку наведалі паслы постсавецкіх краін

— Я чытаў творы Максіма Багдановіча, але не памятаю зараз загалоўкаў вершаў. Падабаюцца мне творы сабраныя ў зборніку „Вянок" і сам Літаратурны музей Багдановіча ў Мінску, які мне ўдалося наведаць. Цікава ён абсталяваны з выкарыстаннем металу, шкла і тканін, — заяўляе Міхал Голуб.

Пасол Рэспублікі Беларусь у Польшчы Павел Латушка, па ініцыятыве якога была наладжана чарговая выстаўка, прысвечаная класікам беларускай літаратуры (раней жыхары Гайнаўшчыны знаёміліся з жыццёвым і творчым шляхам Францішка Багушэвіча, Янкі Купалы і Якуба Коласа), дапамог таксама наладзіць дзелавую сустрэчу дыпламатаў з прадпрымальнікамі Гайнаўшчыны. Ужо ў час выстаўкі вядома было, што такой нагодай пакарыстаецца Сяргей Мартынюк — шэф прадпрыемства „Пронар" з Нарвы, які шукае новых рынкаў збыту для сваіх трактароў і сельскагаспадарчых машын. Паколькі ў ягоных трактарах многа кампанентаў прадукуецца на Мінскім трактарным заводзе, можа з'явіцца добрая нагода рээкспартаваць беларускія трактарныя дэталі праз Польшчу ў постсавецкія краіны. Пасол Павел Латушка пры нагодзе папярэдніх выставак, прысвечаных класікам беларускай літаратуры, прапанаваў прысвоіць гайнаўскай вуліцы імя выдатнага беларускага пісьменніка. Цяпер уручыў ён гайнаўскаму бурмістру Анатолю Ахрыцюку ліст з просьбай ушанаваць такім чынам памяць Якуба Коласа і Янкі Купалы, паколькі ў гэтым годзе прыпадаюць 125-я ўгодкі з дня іх нараджэння. Вонкавы назіральнік мог успрыняць гэтую просьбу як намёк на прапанову назваць так новаствораныя ў горадзе вуліцы. Можа аднак быць інакш. Адкрытая цяпер выстаўка, якую наведалі бурмістр і гайнаўскія радныя, стане штуршком для вынясення прапановы названня гайнаўскай вуліцы імем Максіма Багдановіча.

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

Варта быць прыстойным

„Ніва": — Як у недэмакратычнай, таталітарнай сістэме павінен паводзіць сябе мастак?

Густаў ГАЛЁЎБАК: — Мне здаецца, што па меры сваіх магчымасцей, а яны ў такой сістэме значна абмежаваныя. Трэба паводзіць сябе прыстойна, а гэта значыць, што трэба прапаведаваць праўды ў адпаведнасці з гэтым, што можна назваць мастацкай вернасцю фактам, здарэнням, а перш за ўсё іншым людзям. Паколькі з гэтым у таталітарнай, недэмакратычнай сістэме складана, трэба безупынна шукаць такіх шляхоў, якія б у пэўным сэнсе, значыць, у найлепшым значэнні гэтага слова, падманулі гэтыя ўлады. Трэба сягаць па такія рэчы, якія непасрэдна не кранаюць акрэсленую рэчаіснасць у данай краіне. Трэба карыстацца метафарай, якая, мабыць, не ўпрост датычная сутнасці злачыннасці такой сістэмы, якая з'яўляецца адыходам ад чалавечных праўдаў. Іншага спосабу я не бачу. І трэба чакаць таго, што гэтая сістэма аслабне, аж на канец згасне і тады выбухне сапраўднымі адносінамі да рэчаіснасці.

— Ці байкот, які прымянілі мастакі ў час ваеннага становішча ў Польшчы, з'яўляецца добрым метадам адносін да рэжыму?

— Напэўна, нейкім чынам ён добры. Найлепшым доказам на гэта ёсць тое, што наш байкот іх тады раз'ярыў і спрабавалі яго прытармазіць, ліквідаваць. Ім гэта не ўдалося. Сіла пераконвання асяроддзя была больш паспяховай, чым прычыны, для якіх яны хацелі вырашыць гэтае становішча. Мне здаецца, што ўсё тое спатрэбілася. Напэўна дало ім сігнал, каб задумаліся над гэтым, ці рацыя не на нашым баку.

— Адзначаем чарговую гадавіну Сакавіка 1968 г. Якія адчуванні мелі Вы ў 1968 г., калі Владыслаў Гамулка здымаў „Дзяды" з афіша Нацыянальнага тэатра?

— Можа вам гэта здасца смешным, але ў мяне было адчуванне трыумфу. Гэта значыла, што мы перамаглі. Калі крэцін умешваецца ў такі спосаб, як гэта зрабіў Гамулка, значыла толькі тое, што за намі рацыя. Яго аргументы супраць „Дзядоў" былі цалкам беспадстаўныя, у іх не было ніякіх адносін у рэальнасці. Меў ён на думцы толькі Савецкі Саюз, а не што-небудзь іншае. А такі аргумент быў для нас недапушчальны. Што гэта нас, творцаў, магло цікавіць. Такія аргументы для мастакоў увогуле недапушчальныя. Напрамак нянавісці Міцкевіча да таго рэгіёна Еўропы відавочны, і нічога да гэтага не трэба дадаваць, каментаваць. Можна толькі прадставіць гэты вобраз чужога захопу, які быў у гэтым рэгіёне Польшчы.

— Кім, на Вашу думку, быў Міцкевіч — беларусам, ліцьвіном, палякам?..

— Наколькі ведаю — усім гэтым. Беларусы да яго прызнаюцца, літоўцы таксама, можа ў меншай ступені расіяне. Ды самае цікавае, што ён, усё ж, пісаў па-польску, выбраў якраз гэтую мову для творчасці. І ён не толькі пісаў, але і думаў па-польску, хоць гэта была іншая Польшча, чым сённяшняя. Ды гэта нічога не даказвае — тое, што мы мяркуем, што Міцкевіч быў незвычайнай асобай, вялікім паэтам, якога прысутнасць усюды, у кожнай краіне ёсць больш чым пажаданай. Можа быць прысутны і ў Францыі, і ў Нямеччыне, і ў Амерыцы, калі там хто-небудзь захацеў бы пазнаёміцца з ценем натуры польскай мовы. Гэта таксама датычыць вялікіх паэтаў і пісьменнікаў, хоць бы і беларускіх.

— Як мастакі могуць справіцца з нянавісцю рэжымнай улады і як гэта, напрыклад, адбывалася ў час згаданага байкоту публічных радыёвяшчання і тэлебачання ў час ваеннага становішча?

— У тэатрах іграла нам добра. Нас закідалі кветкамі, нават пару гадоў. Тэатры былі запоўненыя з берагамі, вядома, не ўсе. Публіка збіралася ў неверагоднай колькасці. Гэта давала нам вялікае задавальненне, уражанне патрэбнасці выканання гэтай прафесіі.

— А ў сферы ідэі, некаторых каштоўнасцей, у штодзённым, бытавым сэнсе?

— Трэба гэта ў нейкай меры зразумець. Іншай рады няма. Не бачу спосабу, каб неяк радыкальна супрацьпаставіцца. Моц рэжыму непараўнальна большая, немагчымая да параўнання паміж тымі, хто дыскрымінуе і тымі, каго дыскрымінуюць. Трэба з гэтым фактам у нейкай ступені пагадзіцца і чакаць лепшага часу. Рэшта належыць грамадству, народу, аж прачнецца, ці будзе ён мець ахвоту, каб змяніць сістэму. Усё залежыць ад грамадства. Не памогуць ніякія лозунгі, рэвалюцыі, маніфэсты свабоды. Калі сам народ, напрыклад, беларускі, не вырашыць, каб пазбыцца ўлады такога роду, замяніць яе на іншую і гэткім чынам наблізіцца да еўрапейскай дэмакратыі — дык няма іншага спосабу.

— Вы ўспомнілі аб прыстойнасці. Што такое прыстойнасць і як быць прыстойным? Ці варта?

— Вядома, варта. Захаваць прыстойнасць вельмі проста: трэба быць проста прыстойным. Калісь Антоні Слонімскі сказаў Адаму Міхніку, калі той прыйшоў да яго з дылемай нейкага выбару: „Што б ты ні зрабіў, зрабі ўсё, каб астацца прыстойным. Нічога больш ніхто ад цябе не патрабуе".

— Ці гэта добра, што ў гэты „Ваш" рэстаран, у „Чытэльнік", міфалагічнае месца легендаў польскай культуры і мастацтва, сталі прыходзіць дэпутаты з суседняга „Чытэльніку" Сейма?

— З самога гэтага факта не збіраецца на якія-небудзь перамены нашай сітуацыі. Наша інтэлігенцыя не прымаецца пад увагу ў гэты момант. З гэтай праслойкі людзей хутчэй насміхаюцца, чым яе прызнаюць. Аднак, калі сучасныя дэпутаты заходзяць у „Чытэльнік" і з дапамогай харчавання маніфестуюць прыналежнасць да нашай групы, дык можа будзе лепш.

— Дзякую за размову.

Размаўляў Мацей ХАЛАДОЎСКІ

* * *

Густаў Галёўбэк (г. нар. 1923) нарадзіўся ў Кракаве. Адзін з найвялікшых польскіх акцёраў, легенд польскіх тэатра і фільма. У тэатры дэбютаваў у 1947 г., у фільме ў 1953 г. у ролі Фелікса Дзяржынскага ў „Салдаце перамогі". Іграў на найбольшых і найславутых сцэнах Кракава і Варшавы ў найбольш выдатных польскіх рэжысёраў. Засталася ў гісторыі ягоная роля Конрада ў „Дзядах" А. Міцкевіча ў рэжысуры Казімежа Дэймэка ў варшаўскім Нацыянальным тэатры. Спектакль быў зняты з афішы на асабісты загад І сакратара ЦК ПАРП Владыслава Гамулкі. Стала гэта непасрэдным зачаткам выбуху дэманстрацый і студэнцкіх хваляванняў у сакавіку 1968 г. Патрабавалася тады м.інш. адмяненне цэнзуры.

Археалагічнае памежжа

У палове лютага г.г. выйшла з друку падрыхтаваная Падляшскім музеем у Беластоку кніга п.з. *Stan badań archeologicznych na pograniczu polsko-białoruskim od wczesnego średniowiecza po czasy nowożytne.* Гэта калектыўная праца, якую стварылі і польскія, і беларускія археолагі. Згаданае ў загалоўку кнігі памежжа ахоплівае галоўным чынам прастору нядаўняга Беластоцкага ваяводства; навонкі яго толькі рэдкія экскурсы.

Кнігу пачынае артыкул Крыстыны Бянькоўскай з Падляшскага музея пра гісторыю археалагічных даследаванняў на Падляшшы. Тыя даследаванні пачынаюцца ў палове XIX стагоддзя. У 1853 годзе прафесар Віленскага універсітэта, ураджэнец Бельска-Падляшскага Іосіф Ярашэвіч праводзіць раскопкі могільнікаў у Шчытах-Дзенцялове і Збучы. Неўзабаве іншыя вучоныя даследуюць аб'екты ў наваколлі Сямятыч. Асабліва варта тут вылучыць Сяргея Дубінскага, ураджэнца падсямятыцкай Рогаўкі, які, будучы яшчэ студэнтам гісторыі Пецярбургскага універсітэта, у 1910-1911 гг. даследаваў старажытныя могільнікі

м.інш. у Рогаўцы, Цацэлях, Клюкове і Бацікаx каля Сямятыч ды ў Ляхах і Козліках каля Нарвы. Прыглядаўся ён таксама паселішчам у Агароднікаx над Бугам, у Збучы і ў Рыбалах.

Сяргею Дубінскаму варта прысвяціць больш, чым у разгляданай кнізе, увагі. Пасля першай сусветнай вайны ён спяршо настаўнічаў у Беларусі, у 1925 годзе стаў членам Гісторыка-археалагічнай камісіі Інбелкульта. У 1927 годзе разам з К. Палікарповічам і А. Ляўданскім стварае археалагічную камісію ІБК. Праводзіць археалагічныя даследаванні на ўсёй тэрыторыі тагачаснай Беларусі. У 1930 годзе яго абвінавачваюць у нацдэмаўшчыне, але абвінавачанні ўдаецца тады абвергнуць. У 1933 годзе пераязджае ў Ленінград. Неўзабаве рэпрэсіраваны і 27 жніўня 1937 года расстраляны. Рэабілітаваны ў 1956 годзе...

У царскі час праводзіліся раскопкі яшчэ каля Гродзіска, Драгічына і Тыкоціна. У першую сусветную вайну тэрыторыю Белавежскай пушчы даследуе нямецкі археолаг Альфрэд Гёцэ. У міжваенны час польскія археолагі праводзяць раскопкі каля Драгічына, Гродзіска, а таксама ў Суражы і Курашаве. У пасляваенны час геаграфія археалагічных зацікаўленняў пашыраецца, м.інш. на Гацькі, Гарадок, Лужаны, Мельнік, Клюковічы, Пашкоўшчыну, Краснае Сяло, Малочкі...

Аляксандр Дабрыян з Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта піша пра развіццё археалогіі на Гродзеншчыне ў XIX-XX стст. У артыкуле шмат месца адводзіцца арганізацыйным хадайніцтвам наконт даследавання гістарычнай спадчыны г.зв. Паўночна-Заходняга краю. Ёсць там, аднак, і больш канкрэтныя цікавінкі. 31 мая 1910 года ў вёсцы Падухоўная Калінаўка Беластоцкага павета хлопчык Іван Вайцехавіч Федаровіч пры ўзворванні зямлі знайшоў гаршчок з 47 сякерамі (кельтамі) і 2 кольцамі, з якіх 6 былі пераплаўлены ў кузні, а астатнія адпраўлены ў Імператарскую археалагічную камісію. У 1912 годзе селянін Васіль Пашкоўскі і іншыя каля вёскі Дзяніскі Райскай воласці Бельскага павета знайшлі 42 штукі старадаўніх манет, якія былі пасля адпраўлены ў Паўночна-заходняе аддзяленне Імператарскага рускага геаграфічнага таварыства.

Дарыюш Краснадэмбскі з Інстытута археалогіі і этналогіі ПАН знаёміць з палявымі працамі, праведзенымі за апошнія 15 гадоў у Беластоцкім ваяводстве. Прыводзіць вынікі даследавання гарадзішчаў у Збучы, Клюковічах, Пашкоўшчыне, Заячках, Красным Сяле, Баброўцы, Суражы і Малочках, могільнікаў у Данілове-Малым, Суражы, Збучы і Белавежскай

працяг ☞ 11

http://belnatdress.at.tut.by

Цяперашняя мода змяняецца настолькі імкліва, што часам нават не толькі заўзятым моднікам, але і звычайным людзям, якія папросту хочуць мець сучасны знешні выгляд, становіцца страшна ад пытання: ці будуць праз год у модзе сёлета купленыя чаравікі ці паліто? Зусім іншая справа была ў даўнія часы. Нашым продкам тлуміць галаву гэтымі праблемамі не выпадала — пакрой і афарбоўка адзення не змяняліся, пэўна, стагоддзямі. Якасныя, хоць і старыя рэчы, калі, зразумела, яны не пераўтварыліся ў дзіравыя анучы, пераходзілі ад бабкі да ўнучкі, ад дзеда да ўнука. Так і праходзіў працэс фармавання нацыянальнага касцюма, які не абмінуў і беларускі народ.

Каб бліжэй пазнаёміцца з тымі кашулямі і капелюшамі, якія вызначалі моду нашых продкаў, варта зазірнуць на ўзніклы не так даўно сайт http://belnatdress.at.tut.by. Даны партал так і называецца „Народны касцюм у побыце".

Галоўная старонка выглядае вельмі арыгінальна і прывабна. На фоне ручнікоў і паясоў з беларускім нацыянальным арнаментам, а таксама саламяных капелюшоў знаходзіцца назва сайта. Калі клікнуць на гэтае выяўленне, то апынемся на першай старонцы, з якой на нас глядзіць ці то хлопчык, ці то дзяўчынка ў мужчынскім народным убранні з вялікім кубкам у руцэ.

У правым верхнім вугле ў якасці эпіграфа да гэтага, без сумнення, мастацкага твора месцяцца словы Янкі Купалы, узятыя з верша „Спадчына". Крыху ніжэй прывітальная прамова распрацоўшчыкаў сайта. „Кожнаму пакаленню застаецца ў спадчыну тое, што стварылі талент і працалюбства бацькоў, продкаў, тое, што выяўляе нацыянальнае аблічча народа, яго душу, яго імкненні, тое, што кожнае пакаленне павінна шанаваць і памнажаць, — слушна заўважаюць яны. — Гэты сайт распавядае толькі аб маленькай частцы таго, што засталося нам ад продкаў, таго, што злучае нас у адзін народ і выяўляе ў нас беларусаў, таго, што нам трэба зберагчы для нашых нашчадкаў — аб нацыянальным народным касцюме. Спецыялісты сцвярджаюць, што ніводны прадмет, ніякая галіна ці кніга не могуць даць аб чалавеку, эпосе, тых сведчанняў, якія дае касцюм. Калі б раптам знікла гістарычная памяць, узнавіць ход развіцця дапамог бы менавіта касцюм". Спрачацца з апошнімі словамі не будзем, хоць надта хочацца, бо ідэйныя натхняльнікі сайта не прыводзяць аніякіх доказаў свайго сцвярджэння. І што больш за ўсё расчароўвае ў даным вітанні, гэта адсутнасць яго аўтарства. Дарэчы, каму належыць даволі добры па сваім змесце сайт таксама высветліць не ўдалося. Ягоныя стваральнікі чамусьці палічылі вартым заставацца інкогніта для віртуальнага вандроўніка.

З левага боку, як звычайна, месцяцца выйсці да іншых рубрык. Яны падзеленыя адпаведна частак нацыянальнага касцюма. Для гарадскіх жыхароў, якімі ў большасці і з'яўляюцца Інтэрнэт-карыстальнікі, ёсць добрай нагодай, калі не пазнаёміцца, то асвяжыць у памяці такія назвы як намітка, спадніца-андарак ці латаха.

Кожная старонка змяшчае ў сабе як выяву той ці іншай часткі адзення, так і невялікі тэкст пра яе. Гэта вельмі зручна, бо тут мы знойдзем не толькі апісальную інфармацыю аб рэчы, але і расповед аб спосабах яе шыцця і нашэння.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

Беларусь,беларусы...

На менш прэстыжных стартах

Хоць гістарычна беларусы і прыналежаць да ліку паўночных нацый, зімовы спорт у краіне развіты слабей, чым летні. У некаторых відах айчынныя заўзятары ўжо даўно не маюць на што спадзявацца. У канькабежным спорце даўно не з'яўляюцца новыя зоркі, у скачках з трампліна ніякага росту, у лыжных гонках таксама беспрасветнасць. У гэтых дысцыплінах беларусы не трапляюць цяпер нават у трыццаткі мацнейшых. Так што асноўныя перажыванні гледачоў і слухачоў датычаць хакея і біятлона, як найбольш папулярных відаў.

Ну а самую высокую марку па традыцыі апошняга дзесяцігоддзя трымае айчынны фрыстайл. Пацвердзілі гэта і апошнія спаборніцтвы ў Швейцарыі на Кубак Еўропы. Чарговыя этапы гэтага кантынентальнага турніру паслужылі беларусам добрай падрыхтоўкай да чэмпіянату свету. У мужчын адно першае месца заняў Дзяніс Осіпаў, бронза дасталася Антону Кушніру, Цімох Слівец стаў чацвёртым. На другі дзень золатам вызначыўся зусім малады хлопец Максім Гусцік, які нядаўна стаў чэмпіёнам Беларусі. Так што з рэзервам у нас усё ў парадку. У жанчын па срэбру ўзялі Ала Цупер і Яўгенія Савельева, трэцяе месца ў актыве Асолі Слівец.

На біятлонным чэмпіянаце Еўропы ў Балгарыі беларусам не было роўных у агульным заліку. Аднак перабольшваць гэты поспех не трэба. Першынство старога свету мае малапрэстыжны характар, па значнасці саступаючы нават кожнаму асобнаму этапу Кубка свету. Таму і не выступаюць на ім ужо па традыцыі гранды. І хоць некаторыя вядомыя біятланісты прыехалі (прыкладам, мацнейшы польскі прадстаўнік Тамаш Сікора), асноўным складам выступалі хіба толькі нашы. У такой сітуацыі беларускія страляючыя лыжнікі змаглі рэабілітавацца, заваяваўшы шмат узнагарод. Асабліва вызначыліся дзяўчаты, якія ў апошні дзень выйгралі эстафету — найбольш відовішчную дысцыпліну. У складзе квартэта выступалі Надзея Скардыно, Вольга Кудрашова, Людміла Ананька, Дар'я Дамрачова. Тры апошнія з пералічаных вызначыліся і ў індывідуальных гонках. Мужчынская эстафетная каманда стала бронзавым прызёрам. Можа гэтыя заваёвы дапамогуць вярнуць нашым біятланістам псіхалагічную раўнавагу. Выклікае насцярогу толькі тое, што на паралельным юніёрскім спаборы на той жа трасе беларускія прадстаўнікі выглядалі блякла.

Што ж датычыць хакея, то пераважную ўвагу на мінулым тыдні выклікаў фініш рэгулярнага чэмпіянату Беларусі. Па яго выніках размяркоўваліся месцы ў васьмёрцы мацнейшых і фармаваліся пары ўдзельнікаў плэй-оф. Для „Віцебска", кіеўскага „Сокала" і „Брэста", якія занялі месцы з 9-га па 11-е чэмпіянат ужо завершаны. Ну а прэтэндэнты на ўзнагароды „пасеяліся" класічна (1-е месца — 8-е, 2 — 7, 3 — 6, 4 — 5): „Керамін" (Мінск) — „Металург" (Жлобін), „Дынама" (Мінск) — „Нёман" (Гродна), „Юнацтва" (Мінск) — „Гомель", „Хімвалакно" (Магілёў) — „Хімік-СКА" (Наваполацк).

Сочаць прыхільнікі хакея і за нашымі легіянерамі. Аляксей Калюжны з омскага „Авангарда" па-ранейшаму ідзе ў спісе лепшых бамбардыраў расійскай суперлігі. Руслан Салей вынікова гуляе ў НХЛ у „Фларыдзе", але клуб на вачах траціць шанцы на тое, каб трапіць у Кубак Стэнлі. А Андрэй Касціцын атрымаў чарговы шанц замацавацца ў складзе „Манрэалю". Горш пакуль справы ў Міхаіла Грабоўскага. Але добра, што на ўсіх траіх можа разлічваць беларуская зборная на веснавым чэмпіянаце свету.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Аўгустоўскі канал Ласмінскага

Ваяводскі асяродак анімацыі культуры і Генеральнае консульства Рэспублікі Беларусь у Беластоку запрасілі 15 лютага г.г. на адкрыццё выстаўкі фотаздымкаў Аляксандра Ласмінскага „Аўгустоўскі канал" у галерэі ВААК „Сподкі" па вул. св. Роха.

Аўтар фатаграфій, народжаны ў Лідзе ў 1950 г., больш вядомы нашым чытачам як аўтар тэлефільмаў м.інш. пра Віктара Шведа. З'яўляецца ён выпускніком факультэта журналістыкі БДУ. Шматразова атрымліваў узнагароды за сваю творчую працу на тэлебачанні як аўтар праграм і цыклаў перадач. Яго досвед у галіне фатаграфіі пачаўся ўжо ў пачатковай школе, калі стаў лаўрэатам міжнароднага фатаграфічнага конкурсу. Як студэнт другога курса падрыхтаваў сваю першую персанальную выставу. Яшчэ ў студэнцкія гады супрацоўнічаў з фотаклубам „Мінск", удзельнічаў у першым агранізацыйным сходзе народнага фотаклуба „Гродна", у першай ягонай выстаўцы, а цяпер з'яўляецца яго старшынёй, а таксама членам улад рэспубліканскага прафсаюза фатографаў РБ. Увесь вольны час прысвячае фатаграфіі, арганізаванні выставаў, семінараў, пленэраў, фатаграфічных фестываляў, а таксама навучанню маладых фатографаў. Супрацоўнічае з польскімі фотамастакамі, таксама і з беластоцкімі. Раней Ласмінскі працваў перш за ўсё ў жанры рэпартажу, цяпер яго ўлюбёнымі тэмамі здымкаў з'яўляюцца партрэт і краявід. Пра Ласмінскага гэтак піша Святлана Куль-Сільверстава: „Калі партрэт — дык заўжды псіхалагічны, калі пейзаж — маляўнічы і рамантычны". У апошні час дамінуе ў яго працах тэматыка Аўгустоўскага канала, возера Свіцязь, Прынямоння. Аўтар паказвае на сваіх маляўнічых здымках, шчырых і заадно паэтычных, насычаных няяркім святлом і спакоем, Аўгустоўскі канал з усім яго патэнцыялам экасістэмы ды з журналісцкай рэфлексіяй. Выйшаў таксама ў свет 10 студзеня 2007 г. альбом „Аўгустоўкі канал", у якім змешчана амаль сто здымкаў гэтага месца гісторыка-культурнай і эканамічнай спадчыны Беларусі і Польшчы. На здымках адлюстравана абноўленая беларуская частка Аўгустоўскага канала. Значнае месца займаюць здымкі, выкананыя з самалёта. У фотаальбоме змешчаны тлумачэнні аб'ектаў, а таксама дакладная карта-схема абноўленай часткі канала, апісанне ўсіх яго шлюзаў, інвестыцыйных праектаў, якія будуць рэалізавацца ў зоне канала. У выдавецтве „Беларусь" рыхтуецца выданне альбома ў перакладзе на польскую мову. На жаль, на выстаўцы аўтар не меў зашмат экземпляраў фотаальбома, адно толькі падарункі для слушна заслужаных у арганізацыі выстаўкі і сяброў-супрацоўнікаў (сярод іх быў кіраўнік польскай часткі канала Эдмунд Францішкевіч, які заявіў, што польская частка канала будзе адкрытая ўжо да чэрвеня г.г.).

Аляксандр Ласмінскі правёў шматлікіх гледачоў па круглай выставачнай зале ВААКа, паясняючы аб'екты на кожным здымку, расказваючы і пра гісторыю гэтага унікальнага гідратэхнічнага збудавання XIX ст., створанага для адкрыцця воднага шляху да партоў Балтыйскага мора ў абход тэрыторыі Усходняй Прусіі, якая ў той час увяла вялікае мыта на тавары. Аўгустоўскі канал будаваўся пад кіраўніцтвам ваеннага інжынера Ігната Прандзынскага, праект быў закончаны ў 1824 г. Перапыненае паўстаннем 1831 г. будаўніцтва канала, аднавілася ў 1833 г. і закончылася ў 1839 г. Сёння канал праходзіць па рэках Бобра, Нета, Чорная Ганча праз азёры Сайна, Нецка, Сцюдзёнае, і адкрываецца ў Нёман. Другая лінія канала на рэках Нёман — Дубіса — Віндава (цяпер Вента) засталася няскончанай. Паводе праекта нітка канала павінна была скласці 395 км, пабудавана было 101,2 км. Аўтар здымкаў з любасцю расказваў пра сваё захапленне прыродай, гонар ад старання адбудоўнікаў і краіны, якая не пашкадавала сродкаў для аднаўлення гэтага аб'екта са свайго боку, успамінаў таксама, як калісьці канал служыў для гаспадаркі. На канале было 18 шлюзаў, мноства мастоў, плацін, службовых будынкаў. Па ім перавозілі муку, соль, збожжа, крэйду, гіпс і іншае, быў порт са спецыяльнымі дарогамі для коней, каб цягнуць баржы ўверх супраць цячэння. З 1852 г. па ім сплаўлялі ўжо толькі гіпс, а з сярэдзіны 60-х гадоў пра канал амаль забылі. Пасля II сусветнай вайны была рэстаўравана толькі польская частка. Даўжыня беларускай часткі канала складае 22 км, глыбіня 1,8 м. Налічвае яна 3 шлюзы і 2 плаціны, 4-ы шлюз знаходзіцца на мяжы з Польшчай. Цяпер ён мае служыць турыстам, мае яднаць краіны.

(лук)

Успамін аб Калядах

Даўно ўжо прайшлі калядныя святы. Астаўся ад іх адзін успамін, параўнанне як цяпер і даўней людзі святкавалі Каляды, як яны жылі, весяліліся, як Госпаду маліліся і ў царкву хадзілі. Аказваецца, адмянілася ўсё.

Перад Калядамі ў маёй сям'і было так: бацька валок у хату мяшок сена, пад абразы ў куток ставіў сноп жыта. Такі абычай у той час быў. Сядалі мы вячэраць амаль у сене самым, а пасля вячэры дзеткі ў сене начаваць раскладаліся. На досвітку, вярнуўшыся з царквы, бацька сена збіраў і скаціне заносіў. Праўда, пад абрусам крыху сена аставалася.

А што цяпер ад таго абраду асталося? Некаторыя крышку сена пад абрус кладуць, але так, каб не смяціць і не пабрудзіць дываноў. Большасць гэты абрад патапталі, бо адкуль ім узяць сена, калі зранку траву косяць, а адвячоркам ужо на панадворак вязуць, у так званыя „бэлі" пакруцяць і фольгай яго абвінуць. Прывёзшы дадому, пад плотам трымаюць, у стадолу зусім не хаваюць. А як неадпаведна зробяць, дык і кароўка яго есці не хоча. Яно ж на ўсю ваколіцу такі арамат дае, што нос затыкай. Такога сена на стол не паложыш. Каляду ў кут таксама не ставяць, бо жыта няма. Улетку камбайн усё збожжа так скруціў, змалаціў, што і саломы на Каляду мужыку не пакінуў. Мужык у разгар жніва аб Калядах і не падумаў. Вось і так прападае абрад.

І ёлка лесам не пахне, бо ў лесе яна — пластмасавая — не была.

А што ненатуральнае, карысці людзям не дае. На малітву ў царкву яшчэ крыху ідуць, але штогод у царкве народу меней. Інакш таксама выглядала само калядаванне. Даўней, калі бульбу капаць пачыналі, тады ўжо хлапчукі рыхтавалі гвязду і ўвесь Піліпавы пост развучвалі калядныя песні. А ў час калядавання вёска з самага вечара выглядала святочна, каляднікі ад хаты да хаты хадзілі з гвяздай, Госпада славілі і за свой труд прасілі заплату. Спярша ішлі хлапчукі, потым старэйшыя, а на астатак — кавалерка. Пачыналі калядаваць з поўдня вёскі, ад чыгункі. Пройдуцца праз усю вёску са спевам і ад шашы пачынаюць з хаты ў хату хадзіць, славіць Госпада ды віншаваць гаспадара. А гаспадары грошы плацілі і то нямала, каб толькі іх не абгаворвалі. Не ў адной хаце такую гаворку было чуваць: „А што, кавалеры прыйшлі?" — пытае мужык. „Так, так", — кажа гаспадыня. „Тады больш ім давай, не шкадуй. Раз жа ў год такое свята". На другі дзень хлопцы канчалі калядаванне, лічылі грошы і адзін браў іх на перахаванне.

Потым ехалі ў царкву і за здароўе моладзі закуплялі абедню. Уся моладзь прысутнічала ў царкве. Супольна маліліся, прасілі Госпада наступнага года дачакаць. Вярнуўшыся ў вёску, ладзілі супольны абед і танцы. Не адзін дзень так гулялі. А потым яшчэ доўга, доўга гэтае ўспаміналі.

А цяпер прапала ўсё. Моладзі амаль у вёсцы не асталося, а хто і астаўся, дык спяваць не патрапіць. Няма звонкіх галасоў. Апошні раз кавалерка ў нас калядавала добрых некалькі гадоў таму. Толькі закончылася гэта не так як трэба. Калі грошы падлічылі і перахаваць аднаму аддалі, каб улетку за гэтыя грошы патанцоўку наладзіць, штосьці хлопцаў падкусіла прапіць грошы. Некалькі дзён дурнямі яны прахадзілі... і з гэтай пары сярод кавалераў загінуў калядны абрад.

Цяпер за дня пару дзетак пройдзе, каб некалькі грошыкаў у гэты дзень здабыць. А яшчэ на другі ці на трэці дзень з самай Гайнаўкі прыязджаюць да нас і амаль ужо толькі за грашыма. На плячах носяць гвязду. І калі гаспадар толькі заплаціць, ідуць з-пад акна.

Вось на нашых вачах прападае абычай. А вельмі шкада. Нічога яго не заступіць. Конкурсы калядавання гэта не тое. Гэта абумерлы абрад, не жывы. А мы б хацелі, каб даўнейшы абычай з намі быў.

Грыша МАРОЗ

Прэзентацыя

Напрыканцы студзеня атрымаў я запрашэнне ад фірмы „Lama Gold" з Познані на прэзентацыю пасцелі „Здаровы сон" 1 лютага г.г. у Нарваўскай гміннай бібліятэцы. Падумаў я пакарыстацца запрашэннем. У будынку бібліятэкі сабралася многа людзей, прэзентацыя адбывалася ў дзвюх групах — а 17 гадзіне і ў 18.30.

Прадстаўнік фірмы вельмі расхвальваў пасцель, што яна і лячэбная, і рэабілітацыйная, што зроблена з высакаякаснай аўстралійскай воўны, гэта значыць, з аўстралійскіх мерыносаў. Камплект пасцелі для дзвюх асоб складаўся з покрыва размерам 200 х 180 см, коўдры такога ж размеру, дзвюх вялікіх падушак і дзвюх маленькіх. На гэты камплект пасцелі, як паінфармаваў прадстаўнік фірмы, выкарыстана 8 кілаграмаў воўны. Цана камплекта — 3 700 зл. Другі камплект, толькі з іншым узорам, каштаваў 3 500 зл.

У запрашэнні гаварылася, што кожнае сужонства, якое прыме ўдзел у прэзентацыі атрымае дармова падарак вартасцю ў 150 зл. ды шампанскае. І сапраўды далі і шампанскае, і падарак у выглядзе накідкі на табурэтку размерам 30 х 30 см з надпісам... „ocieplacz kręgosłupa mini". Паводле маёй думкі, такі „квадрацік" каштуе 75 зл., і яго давалі кожнай асобе.

У першай групе, у якой я ўдзельнічаў, людзі выпісалі аж пяць такіх камплектаў пасцелі. Колькі ў другой групе, дык не ведаю, бо спяшаўся я дадому. Калі я ўсё падлічыў, то мне, каб купіць такую высакаякасную пасцель, трэба было б заснуць на шэсць месяцаў зімовым сном. Але навошта тады мне патрэбная тая пасцель, калі б я праспаў усю зіму? А летам так цудоўна цёпла, што няма патрэбы прыкрывацца коўдрай. А разважаючы па-другому, то ці воўна з нашых мерыносаў горшая, якую так цяжка прадаць? Помню некалькі гадоў таму ездзілі па вёсках самаходамі купцы і куплялі воўну ад сялян плацячы па... 2 зл. за кілаграм. Гэта ж так танна, што аж цяжка паверыць.

Наша айчынная воўна напэўна не горшая, а на коўдру чэсанай воўны трэба толькі 2 кілаграмы. У мяне ёсць рама для шыцця коўдраў, жонка растлумачыць як пашыць і гэтая здзелка атрымаецца вельмі танна. А можа і прадстаўнікі гэтага прадпрыемства ездзяць па вёсках, купляюць воўну і шыюць пасцель?

Мікалай ЛУК'ЯНЮК

9 ☞ працяг

пушчы ды паселішчаў у Патоцы, Баньках і Сольніках.

Наталля Пачобут з Гродзенскага дзяржаўнага гістарычна-археалагічнага музея знаёміць са знаходкамі з могільніка між Курашавам і Лядамі, якія зараз знаходзяцца ў фондах ейнай установы. Раскопкі на гэтым могільніку пачалі быццам вяскоўцы, якія „апантаныя альбо цікаўнасцю альбо скарбашукальніцтвам, яны нават непатрэбныя для іх рэчы акуратна сабралі" — гэтак напісаў у 1932 годзе курашаўскі настаўнік Міхал Давідзюк гродзенскаму кусташу Юзафу Ядкоўскаму. Аднак трэба меркаваць, што зачын даў сам Давідзюк, які паходзіў з Наройкаў і, верагодна, клюнуў там на кручок раскопак, якія навокал праводзіў быў раней Сяргей Дубінскі.

Іаанна Ваўжанюк ставіць гарадзішчы ў Малочках і Гацьках на фоне ўсёй славянскай прасторы: пра апошняе аўтарка мяркуе, што было яно „miejscem rodzącym władzę". Галіна Карвоўска і Аляксандр Анджаеўскі пішуць пра вынікі раскопак у Дубне. У заканчэнне дадам, што плён з Дубна будзе два тыдні з 19 сакавіка паказаны ў Боцьках, пасля месяц у Бельску і з чэрвеня ў беластоцкай ратушы.

Аляксандр ВЯРБІЦКІ

Stan badań archeologicznych na pograniczu polsko-białoruskim od wczesnego średniowiecza po czasy nowożytne pod redakcją Haliny Karwowskiej i Aleksandra Andrzejewskiego, Białystok 2006, ss 240. Nakład 700 egz.

Пра радных і іх даходы

Ніколі не цікавілі мяне чужыя заробкі і калі б артыкул Раіны Стэфанчук „Добра нам жывецца" („Ніва" № 6/2007) з'явіўся ў іншым выданні, то пэўна я і не прачытаў бы яго. Але ніўскі тэкст прачытаў я ўважліва, прадумаў змешчаныя ў ім даныя і выцякаючымі адсюль высновамі хачу падзяліцца з шырокім колам чытачоў.

Здзіўляе мяне перш за ўсё факт, што калі хтосьці стане ваяводскім ці гарадскім дэпутатам, то яму мала адной кватэры. Я зразумеў бы гэтую заканамернасць, калі б дэпутаты выкарыстоўвалі свае кватэры на шматлікія сустрэчы з выбаршчыкамі дзеля выслухоўвання іх балючых спраў і пастулатаў, каб разам з электаратам разважаць, што карыснага можна яшчэ зрабіць для дзяржавы і грамадства. Гэта магло б перашкаджаць жонцы ці дзецям. Але хаця я жыву ўжо даволі доўга, то яшчэ такога дэпутата не сустрэў.

Чарговая справа гэта даход ад пасады раднага. Пералічыў я пададзеныя аўтаркай лічбы і аказалася, што дэпутаты ў сярэднім бяруць з дзяржаўнай касы па 1600 зл. у месяц. Пытаюся: за што? Ідучы на выбары, кожны кандыдат у дэпутаты горача дэкларава ў волю служыць грамадству! Ну дык няхай служаць, няхай маюць ад гэтага задавальненне, але не псуйма іх грашыма! Калі неабходныя ім грошы на нейкія тэхнічныя выдаткі (даезды, канцылярскія тавары, пральны парашок, каб мець чыстую кашулю), прапаную плаціць кожнаму па 300-400 зл. у месяц — і гэтага будзе дастаткова. Мяне застаўляюць жыць на 400 зл. у месяц — гэтага павінна мне хапіць на ўсё: харчы, вопратку, лякарствы і г.д., а ім хапіла б на паперу і ручку. Ці ж тое, што яны робяць, такое адказнае, што столькі ім трэба плаціць? Я не заўважаю гэтага.

Ну, але калі быццё радным звязанае з так бестурботным жыццём, тады нічога дзіўнага, што ў час выбараў многа ахвотных пхнецца ў кандыдаты, а некаторыя ўжо дзесяцігоддзямі засядаюць у радах. Так, так, ужо некалькі дзесяткаў гадоў кіруюць намі дэмакратычна выбраныя шэфы гмін у размаітых Мельніках, Дубічах ці Кляшчэлях (пералічваю ў якасці прыкладу). Наглядаючы за заслугамі некалькіх такіх гмінных кіраўнікоў, бачу перш за ўсё глыбокую заклапочанасць... забеспячэннем сабе чарговага тэрміну паўнамоцтваў. Бо ж нашы прадстаўнікі, якія распараджаюцца немалымі публічнымі грашыма, большасць сваіх дзеянняў умеюць прадставіць так, каб выглядала, што ён, пан войт, асабіста даў нешта адной ці другой вёсцы, а не зрабіў мінімуму таго, за што кожны месяц бярэ немалую зарплату. Штораз часцей не дае мне спакою думка, што пажадана было б увесці абмежаванне колькасці тэрмінаў як на выканаўчых пасадах, так і на дэпутацкіх. Максімальна два тэрміны — і дзякуем! Хай прыйдуць да ўлады іншыя, можа не горшыя і не дурнейшыя.

А цяпер прызнаюся вам, дарагія чытачы, чаму выношу пастулат зраўнання велічыні месячнай даніны радным з самай нізкай інваліднай пенсіяй: з чыстай дбайнасці пра свае інтарэсы. Бо калі б народныя абраннікі пачалі атрымоўваць такія ж грашакі што і я, то хуценька павысілі б узровень самых нізкіх пенсій. Такім чынам і ў мяне была б нейкая карысць ад дэмакратыі.

Марк ЦЫБАРТ

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano przy udziale wsparcia finansowego Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.

Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.

Камп'ютэрны набор і карэктура: Яўгенія Палоцкая.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na II kwartał 2007 r. upływa 5 marca 2007 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na II kwartał 2007 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 120,00; pocztą lotniczą Europa — 133,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 147,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 68124010531111000004430494.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,55 zł, a kwartalnie — 46,15 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą: kraje europejskie — 5,00 (kwart. — 65,00), kraje pozaeuropejskie — 5,20 (kwart. — 67,60). Pocztą priorytetową: kraje europejskie — 6,00 (kwart. 78,00), Ameryka Półn., Afryka — 6,70 (kwart. — 87,10), Ameryka Południ. i Środ., Azja — 7,80 (kwart. — 101,40), Australia — 10,00 (kwart. — 130,00). Wpłaty: Rada Programowa Tygodnika „Niwa", BPH PBK SA O/Białystok 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.
Nakład: 1 834 egz.

Суседскія былі

ВЕЛІЧ ТРАДЫЦЫЙ

Старэнькі дабіты аўтобус, прарываючыся праз трактарныя каляіны і калдобіны невядомага паходжання, насуперак непераадольным законам усіх навук, усё ж змог дацягнуць некалькі пасажыраў да невялічкай кучкі старэнькіх хатаў, што па былой звычцы яшчэ называліся вёскай. Ды не паспеў Даніла Супрун вылезці з яго, як апынуўся адной нагой па калена ў восеньскім няўтульным балоце, якое запырскала не толькі неасцярожную нагу, але і ўсе астатнія часткі цела аж па самыя вушы. Другая нага застыла на прыступках незаменнага транспарту міжраённых камунікацый, настойліва адмаўляючыся пакідаць адзінае сухое месца ў радыусе дванаццаці кіламетраў. Даніла вылаяўся самым брудным трохпавярховым матам, які аніяк не адпавядаў апранутаму толькі сёння новенькаму касцюму ў камплекце з белай кашуляй, гальштукам і букетам ружаў у руках ды непамернай сілай волі прымусіў непаслухмяную ніжнюю канечнасць адпусціць транспарт у адваротны шлях. І аўтобус, удзячна газануўшы, чым яшчэ больш дабавіў Данілавай постаці колеру, адпавядаючага навакольнаму асяроддзю, паскакаў па глыбокіх лужынах, якія па незразумелых прычынах называюцца вясковай дарогай.

— Хіба жаніцца надумаўся, што кветкі цягаеш з сабой, як сабака костку, — пачуў Супрун за плячамі насмешлівы жартаўлівы голас. — Але выгляд у цябе такі, што ўзяць у жонкі хіба хочаш Зосьчыну свінку. Толькі яна за цябе не пойдзе. Ёй вясной кныра прыводзілі, то выглядаў той нашмат чысцейшы ад цябе.

Даніла злосна азірнуўся і ўбачыў на прыпынку дзеда Аркашку, які, седзячы на лаўцы, сачыў за сваёй тоўстай каровай, што пасвілася недалёка ад так званай дарогі. Пра гэтага дзеда юнак шмат чаго чуў такога, што магло б прывесці ў стан панічнага жаху самага вялікага смельчака бітвы пад Ватэрлоо. Рэпутацыя ў Аркашкі была такой, што нават румынскі граф Дракула выглядаў у параўнанні з ім як нявінная авечка. Казалі пра дзеда, што больш душ загубіў на гэтым свеце, чым засталося. Усю вайну чужакоў страляў. І не толькі чужакоў. Дзе ж столькі патронаў ён набраў?! І як яму ўдалося ад астрога ўратавацца? Можа таму, што новая пасляваенная ўлада не ведала пра бурную маладосць Аркашкі. Нават медаль далі яму за партызанскія заслугі. А старую ўладу той са сваёй бандай перабілі ўсіх да аднаго. І бальшавікоў, і немцаў. Ды і людзі на Ашмяншчыне скрытныя. Іх хоць душы, як паганага ката — нічога не скажуць. А не пытайся, дык тым больш дзюбы не расчыняць. Вось і не данеслі. Можа самыя той улады недалюблівалі, а можа Аркашкавай помсты баяліся. Толькі паміж сабой, цішком, і з нейкай незразумелай цеплынёй у голасе, і то як моцна нап'юцца, называлі старога Аркашку кішкалупам.

— Ажэнішся тут у вас, — прабубнеў Супрун, прымасціўшыся на лаўцы ля кішкалупа. — Сёння збіраўся з будучай цешчай пазнаёміцца. Дык бачыш які канфуз! Куды я цяпер такі!

— Што праўда, то праўда, — адказаў уздыхам былы Джэк-трыбушыцель. — Зоська ў нас — баба спраўная, акуратная. У яе не толькі дачка Зінулька, але і прыбіральня больш прывабна выглядае, чым ты зараз. А чаму сватоў не прыслаў на пачатку?

— Якія сваты?! — махнуў рукой самы брудны на свеце жаніх. — Хто цяпер гэтай дурнотай займаецца? Часы не тыя.

— Эх, моладзь, — сплюнуў стары ўладальнік партызанскага медаля. — Вучыш вас вучыш, а вам усё не даходзіць. Не хочаце, значыць, жыць згодна з нашымі звычкамі. Быў тут адзін такі, царства яму нябеснае. Пасля вайны да Зоські сватаўся. Да гэтай, чыю дачку ты сабе прыгледзеў. Гаварылі яму людзі: „Прысылай сватоў". А ён кажа: „Перажыткі гэта. Будзем жыць па-новаму". Ой, моцна ён мяне тады ўзлаваў. І не таму, што гэта быў савецкі афіцэр з іхняй контрразведкі. Хадзіў, падла, па лясах, нашых хлопцаў вылаўліваў. І не з-за Зоські. Мне то яна і самому падабалася. Ды не толькі яна адна, — тут дзед на хвіліну зрабіў паўзу, паглыбіўшыся ва ўспаміны юнацтва, але хутка вярнуўся да павучання. — Узлаваў ён мяне таму, што па-нашаму не хоча жыць. І смяецца яшчэ з нашага, брыда. Ну дык яго напачатку лёс пакараў. Прыйшоў, значыць, гэты афіцэрык да Зоські. З мамай знаёміцца. Так як ты зараз. Зоська на стол збірае, па самагонку некуды паляцела, а жаніх, значыць, думаў што адзін у хаце застаўся. І так яму ад хвалявання бруха схапіла, што не ведае што рабіць. Уздула, небараку, як карову, якая цвік праглынула. Думае, трэба газы выпусціць. Але ж у хаце смярдзець будзе. То ён сунуў свой ваенны зад за печку і як даў, што мала посуд не паразлятаўся. А за печкай, акурат у гэты момант Зосьчына мама спала. Спрасонку ад такога выбуху думала, што зноў вайна пачалася. Як закрычыць, нібы недарэзаная авечка. А жаніх ногі ў рукі і на пяту. Больш яго тут і не бачылі. Саромеўся нават на вочы патрапіць. Яго пасля некуды да латышоў адправілі. Іхных бандытаў лавіць. Але хіба не даехаў ён да тых латышоў. Нехта цягнік у рэчку спусціў. Мост узарвалі. А можа і ўратаваўся якім цудам? Халера яго ведае. Толькі тут ён больш не з'яўляўся, — тут дзед крыва ўсміхнуўся, хіба радуючыся таму, што перажыў усіх аднагодкаў якіх ведаў і якія беларускіх традыцый не паважалі і, падняўшы палец угору, зрабіў выснову: — Трэба трымацца старых звычаяў. А то бачыш, як яно! Лёс такіх людзей карае. Вось і ты, чаму думаеш, увесь у балоце? Гэта табе першы намёк лёсу.

Ад гэтых слоў і ў гэтага жаніха так бруха схапіла, што кінуўшы ўбок кветкі куляй паляцеў у бліжэйшыя кусты. А назаўтра старэнькі аўтобус прывалок у вёску сватоў. Таксама ў касцюмах, пад белымі кашулямі, у гальштуках на тоўстых шыях, якія пасавалі ім як карове конскі падсядзёлак, з ручнікамі праз плячо і ў старанна адшліфаваных кірзавых ботах. Пасля ўжо выгляд тых сватоў мала адрозніваўся ад учарашняга аблічча жаніха. Адзін, налізаўшыся гарэлкі недзяржаўнай вытворчасці, паваліўся ў балота, не дайшоўшы да прыбіральні. Другі, маладзейшы, усе куты абрыгаў у хаце маладой. Але справу сваю сваты зрабілі. Дзяўчыну сасваталі і дзень вяселля прызначылі.

А вяскоўцы не маглі нацешыцца з Данілы. Во, казалі, які спраўны хлопец. Усё зрабіў па-людску, па-нашаму. Трымаецца старых звычак. А што сваты трохі зашмат загуляліся і выглядалі бы калгасныя парсюкі, то малады невінаваты. Як кажуць, што дазволена кату, то не дазволена сабаку. Нічым асаблівым, маўляў, тыя сваты, калі ўжо быць да канца шчырымі, традыцый не парушылі.

Віктар САЗОНАЎ

Адгаданка

1. аўтамабіль, 2. паглыбленне ў зямлі, 3. прозвішча аўтара „Партрэта Дарыяна Грэя", 4. расійскі губернскі горад у Забайкаллі, 5. псеўданім лацінаамерыканскага рэвалюцыянера Эрнеста Гевары, 6. Вольга, гродзенская пісьменніца, 7. сталіца Сірыі, 8. двухвокіс крэмнію, 9. самчык буйной рагатай жывёлы.

Адгаданыя словы запісаць у вызначаныя дарожкі, пачынаючы ад поля з лічбай. У светлых палях атрымаецца рашэнне — пагаворка. **(ш)**

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 4 нумара

Дуга, вядро, клізма, снег, аналогія, багаслоў.

Рашэнне: **Гром з яснага неба.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Мікалаю Сазановічу** з Навін Вялікіх і **Аляксандру Дабчынскаму** з Беластока.

04.03 – 10.03

Баран (22.03. — 20.04.) Ахвота парваць з некаторымі знаёмымі (няма, мабыць, сэнсу ратаваць здаўна кульгаючыя сувязі). Рэфлексіўны настрой. Пагаршэнне адносін з супрацоўнікамі. З 8.03. маеш шанц падпісаць карысную дамову.

Бык (21.04. — 21.05.) Магчымае здзяйсненне мараў і сустрэча ідэалу кахання. Будзеш субтыльны, уражлівы, асабліва на музыку. Да 7.03. нядобры час для важных рашэнняў (хтосьці са знаёмых можа цябе абдурыць).

Блізняты (22.05. — 21.06.) Складанасці ў справах. Цяжка засяродзіцца, недахоп дысцыпліны, нецярплівасць і нястойкасць. Дома клопаты, хтосьці з блізкіх можа захварэць (усё кончыцца няблага). Асоба, якою захопішся, можа аказацца паскудай. Арыгінальныя ідэі спадабаюцца шэфу.

Рак (22.06. — 23.07.) Поўня і зацьменне Месяца (4.03.) з аднаго боку развеюць твае сумненні, ды даведаешся чагосьці, што папсуе табе настрой. Да 7.03. можаш вырашыць важны выбар, які шмат зменіць у тваім жыцці. Будзеш больш адкрыты і кантактны.

Леў (24.07. — 23.08.) Будзеш дзейнічаць з фантазіяй, да ўсяго падыдзеш з дыстанцыяй. З 7.03. можаш залішне хваліцца (багаццем, дасягненнямі і талентамі), надувацца, чым можаш моцна раздражняць іншых.

Дзева (24.08. — 23.09.) 4.03. могуць нахлынуць на цябе невясёлыя ўспаміны (не азірайся назад!). Не вырашай нічога без роздумаў, не лезь на ражон, выклікаючы канфлікты. Некаторыя акалічнасці могуць быць нямілым сюрпрызам.

Шалі (24.09. — 23.10.) Энергія будзе цябе проста разносіць. Будзеш самаўпэўнены, адважна пераможаш усе перашкоды. Да 7.03. цяжкавата наладжваць кантакты і афармляць справы, на якіх табе залежыць. Выпадковая асоба можа распаліць у табе жар пачуццяў.

Скарпіён (24.10. — 22.11.) Можа чакаць цябе палымяны службовы раман, ды не спадзявайся, што адменіць тваё жыццё. На шчасце, надаўжэй палюбяць цябе грошы.

Стралец (23.11. — 22.12.) З 6.03. пашанцуе табе і ў каханні, і ў інтарэсах. З 7.03. не прадбачваецца ніякая катастрофа, ды каб пазбегчы клопатаў, не выхвальвайся і не вылазь перад аркестр, бо знойдзецца хтосьці, хто схоча табе ўцерці нос.

Казярог (23.12. — 20.01.) Будзеш больш разважлівы, спакойны, дзякуючы гэтаму пашчасціцца табе ў каханні ды інтарэсах. Ідэальная атмасфера ў хаце.

Вадалей (21.01. — 19.02.) Ахвота ламаць правілы і загады, але і падзейнічаць. Будзь асцярожны, каб не падпасці шэфу ці непрадумана вырашыць нейкую справу. Твой сон аб вялікай любові здзейсніцца.

Рыбы (20.02. — 21.03.) Будзеш поўны красы, вабнасці. Поспехі ў сяброўстве і любові. Дзякуючы фантазіі і інтуіцыі ўдасца табе пераставіць сваё жыццё на іншыя пуці. Не чапай жалезнага запасу — неўзабаве можа спатрэбіцца.

Агата АРЛЯНСКАЯ

ISSN 0546-1960

1941 на Беласточчыне - II

Ніва

ПРА МІНУЛАЕ

Сумежныя сустрэчы - IV

ВЯСКОВАЕ ВЯСЕЛЛЕ

Мінула Руздво, Новы год, наступіла Маслена, як у нас называлі перыяд да Вялікага посту, што перад Вялікаднем. Менавіта ў той час уся вёска рагатала ад радасці, маладосці — музыкі, дзіваснубы, вяселлі...

— Сёлета кароткія Мясніцы, — паінфармавала мяне сястра Надзя. — Глядзела ў ніўскі каляндар, святы 8 красавіка. Раненька.

— Якая розніца — рана ці позна, — азвалася абыякава я. — Няма ўжо гульняў, дзіваснубаў, вяселляў... А помніш, даражэнькая, як весела было калісьці ў вёсцы?

— Помню, помню, а як жа, хаця з вёскі выехала ў горад за працай, маладзенькая была. А бацькоў, як сама ведаеш, часта наведвала. Не раз з сяброўкай тырчала пад акном, калі прыехаў да каторай дзіваснуб з чужой вёскі. Хацелася ўбачыць — прыгожы, ці брыдкі? А і бабы-суседкі цікаўна таўпіліся заглядваючы ў незавешаныя вокны. Хацелі не толькі ўбачыць, а то і паслухаць торг за пасаг. Выдатна мусіў малоць языком, каб выціснуць з будучага цесця як найбольш грошыкаў, калі дзеўка была невялікай красы.

— То так, як у пастаноўцы „Пярэстая красуля", жонка ж не карова! Ох, які жах!

— А памятаеш, як мама расказвала пра сваячніцу цёткі Ганны? Прыехала яна з вяселлем у царкву, стаіць у прытворы храма, чакаючы шлюбнай цырымоніі, а тут адзін з дружбаў ціхенька шэпча маладому на вуха: „Чаму жэнішся з такой брыдкай?" А ён на тое: „Бацька кабылу дае!" На няшчасце маладуха ўчула — завярнула сваіх гасцей і ад'ехала дамоў, пакідаючы маларастаропнага жаніха. Бачыш, якая разумная і перш за ўсё адважная была. У большасці дзяўчына не супраціўлялася бацькам, якія сілай аддавалі замуж. Чула ты, як нашу сваячніцу маці ўперла сілай за нялюбага? Усё жыццё наракала на маці. За маёй маладосці, калі што, можна было ўцячы ў горад за працай.

— Калі я падрасла, усе мы пайшлі ў горад вучыцца і самі сабе мужоў выбіралі, — уключылася ў размову я.

— Была я падросткам, калі Матрушка выходзіла замуж. Стаяла няшчасная ў царкве ды слёзы цурком ліліся па шчоках, — цягнула свае ўспаміны сястра.

— І я помню вяселле Матрушкі, хаця была невялікай дзяўчынкай, — падхапіла тэму я. — Усе мы, сяброўкі, пабеглі па каравай, у хату. Не толькі мы, дзеці, — многа напхалася і пажылых жанчын. Так нас сціснулі, што апынуліся амаль на плячах вясельнікаў. Сваты давалі каравай, ды такі быў чорны як хлеб. А бабы кідалі праз нашы галовы. За сталом, у кутку сядзела маладуха, рослая дзяўчына, ля боку якой тырчэў невялічкі, худзенькі жаніх. Не глядзела на людзей, усё выцірала хустачкай слёзы. А вясельнікі, як быццам бы наперакор таму спявалі:

Ой, посохлі тые вербы, што я посаділа,
Нэма того міленького, што я верно полюбіла...

— Ой, Ніна, а ў мяне пыталіся, калі я выходзіла замуж, чаму не плакала. А я адказала: „Забылася!"

— Ха-ха-ха! — зарагатала я. — А чаго ж табе плакаць было? Выходзіла за прыгожага хлопца, вайсковага, а яшчэ ў горад. Адна радасць!

— А ручнічок на шлюбе цягнула я здорава, старасціна хапала, каб ізноў паслаць пад ногі. Няхай, думала, усе мае сяброўкі ідуць хутка пасля мяне замуж, я ж выходзіла першай. Знаеш, як Зінку абгаварылі, яна нават наском не кранула палаценца! Усе мы, сястрычка, выходзілі замуж у горад, а вяселля рабілі бацькі па-вясковаму, з даўняй традыцыяй.

— З твайго замужжа мала што памятаю, — цягнула тэму я. — Запамятала толькі, што сваткі, даўнім абычаем, вышывалі табе ручнікі і шылі шлюбную бялізну жаніху. Шылі, вышывалі і сумную песеньку спявалі аб маладой дзяўчыне, якая, не дачакаўшы вяртання свайго міленькага, выходзіць замуж за другога, нялюбага:

Чыя то дзіўчына шые на машыні,
Ой, чыя то хата стоіт пры доліні?
А машына шые, а дзіўчына плачэ,
Вэрнісе, вэрнісе, мілы мой козачэ...

Раптам Валька, гладзячы падштанікі крыкнула: „Ой, дзяўчаткі, забылі мы зашыць адну калошыну! Хай пацерпіць маладажон, пакуль уцягне на ногі!" — Усе бухнулі смехам і давай зашываць „тое-сёе". Я алюзію не зразумела, а ўсё-такі смешную сцэнку запамятала.

— Як сама ты ведаеш, выехала я з вёскі маючы 17 годзікаў, не паспела прыгатаваць сабе пасагу — ручнікоў, макатак, дываноў... Вяселле маё было скромнае, як ва ўсіх у тыя часы, неўзабаве ж пасля вайны, — працягвала ўспаміны Надзя. — Быў белы каравай, варанае мяса на закуску. А кілішачак гарэлкі на кожным стале адзін. Таму хлопцы нецярпліва паганялі гасцей: хутчэй піце, хутчэй!.. А на вячэру падавалі абавязкова тушаную капусту. Па вячэры, познім вечарам, везлі мяне ў хату мужавых бацькоў, у Войшкі. Паклалі ў воз пасцель, сундук з адзёжай; з намі маладымі пасадзілі майго старшага дружбу — Сцёпу і курыцу. Курыца — гэта даўні вясельны звычай на нашых вёсках. На іншых фурманках ехалі госці мужа. Быў месяц лістапад, імжэў дожджык, вакол цемната. Пераехалі лес, даязджаем да моста, а тут на табе — уцякла пасажная курыца! Саскочыў Сцёпка з воза і давай шукаць — без прыдання нельга завезці маладуху. Знайшоў. Пехатой прыйшоў ці прыехаў — не памятаю, — смеючыся закончыла смешную гісторыю Надзя.

— Калі ўвайшла я ў хату, — працягвала далей, — прывіталася са свекрамі і, пакланіўшыся ўсім чатыром куткам, сыпнула цукеркамі, каб хата была багата і ў гаспадарцы вялося. Развесіла ручнікі і макаткі, хай мо свекра ўбачыць, што нявестка дзелавая і нябедная. А пасцель сваты спраталі ў камору, дзе мы мелі начаваць. Муж выкупіўся гарэлкай і закускай, і толькі тады аддалі нам ключы.

— А мяне нідзе не вазілі. Вяселле было толькі ў нашым доме. Цябе, Надзя, не было, акурат ты нарадзіла сына, была ў шпіталі. Гасціна была багатая, па-гарадскому. Закуску рабіў наняты мяснік, а кілішачак і талерка была кожнаму асобна. Ручнічок таксама далёка не цягнула, калі бацюшка вадзіў нас вакол прастола, а пеўчая спявала „Многае лета". Манька, якая слала палаценца, ледзь вырвала яго з-пад майго абцаса. Сяброўкі ўсміхаліся толькі ад радасці.

А калі вярталіся мы з царквы, хлопцы завязалі шнурком вароты, таксам трэба было выкупіць. У час нашай шлюбнай цырымоніі ў хаце за сталамі гасцявалі старэйшыя, жанатыя госці. Выбіралі „сваіх" маладуху і маладога. Жаніхом была заўсёды жанчына з мужчынскай шапкай на галаве, а мужчыну накладвалі вэлюм з белага палаценца. Доўга трэба было таргавацца, каб уступілі нам месца. Помню, маладым была Марыя, наша далёкая сваячніца з Пескаў; за сталом прыгожа спявала жартаўлівую песеньку:

Сядзела да дубе,
Крычала: Якубе!..

Назаўтра, пасля вяселля, разбудзілі нас з талеркай жаранай яешні, якую мы елі ў пасцелі. Усё вяселле вёў „маршалак" Грыша, твой муж, перавязаны доўгім вышытым ручніком, стукаючы палкай у полапны балёк абвяшчаў — калі сядаць за сталы, выходзіць на гулянку ці перапойку. Перапойка гэта складванне падарункаў маладажонам. Абавязкова трэба было пастукацца кілішкам з маладой парай, а выпіць крышачку, рэшту выліць з размахам за сябе, на вясельнікаў. Каб не быць аблітым, трэба было хавацца па кутках.

— Ты, Надзя, кажаш што забылася плакаць на сваім шлюбе, а мне пацякла слязінка, калі адыходзіла ў храм. Стала перад іконай і, як звычай кажа, зрабіла тры паклоны, перажагналася, а гарманіст зайграў мне жаласны вясельны марш:

Ой, дэ ж ты едеш?
До шлюбу, до шлюбу.
Ой, чом нэ плачэш?
Нэ буду, нэ буду...

— закончыла я ўспамін са свайго вяселля.

На Маньчыным шлюбе мы былі абедзве. Яе ўначы павезлі ў Зубава. Было лета, святога Пятра, на дварэ гарачыня. Ехалі мы з „пэрэзвой" на другі дзень па вяселлі ў хату маладога. Вазы і коні прыгожа прыбраны рознакаляровымі стужкамі і бярозавым голлем. Уязджаючы ў вёску госці грымнулі песню:

Сёлом еду, сёлом еду,
Карчмы нэ мінаю,
А дэ ж моя дiўчынонька,
Котору кохаю?..

Вясельную хату адразу пазналі — над адкрытымі насцеж варотамі высока на тычцы вісела вялікая лялька з перавешаным вядром, аказалася, з вадою. У момант, у які першы воз з вясельнікамі зраўняўся з варотамі, на гасцей палілася вада. Цэлае вядро! Добра, што гарачыня была на дварэ — высахлі.

Не заўсёды на вяселлі былі толькі жарты. Калі жаніліся нашы бацькі, хлопцы любілі драцца, няважна, з якой прычыны. Іх вяселле, у Войшках, як самі расказвалі, разагналі — пахарасталі ўсе вокны дзеду Пятру, а мама-маладуха „дастала" каменем у пяту. Плёскаўцы ўскочылі на вазы, бічом па конях і галопам пагналіся дамоў! А весяліліся на другі дзень, у хаце маладухі.

— З радасцю паўспаміналі мы, дарагая, мінулае, — ціхенька ўжо закончыла я. — А цяпер давай паглядзім на сучаснае вяселле. — Уключыла я касету з вяселлем майго сына Марка і, сёрбаючы чаёк, пачалі мы моўчкі ўзірацца ў тэлевізійны экран.

Ніна БРУЧКО

Памятаць пра „Масленіцу”

Ужо традыцыяй стала, што ў Комплексе школ у Чыжах у зімовы перыяд вучні ў святочнай атмасферы знаёмяцца з беларускімі народнымі абрадамі, якія перадаваліся з пакалення ў пакаленне. Можа, дзякуючы моцна замацаваным у памяці людзей народным традыцыям, па сённяшні дзень старэйшыя і моладзь захоўваюць нацыянальную свядомасць. Жыхары Чыжоўскай гміны не саромяцца свайго мінулага і ў час апошняга перапісу больш за восемдзесят працэнтаў насельніцтва назвала сябе беларусамі. Чыжоўскія настаўнікі, пад кірункам дырэктара Міраслава Пяткевіча, паставілі на вяртанне да традыцыі і многа ўвагі адводзяць навучанню беларускай мовы ўжо з першага класа падставовай школы. Цяпер, толькі за выключэннем дзвюх асоб, усе дзеткі і моладзь вучацца пабеларуску і прымаюць удзел у беларускіх конкурсах.

Вучням трэба было пячы „цешчам” аладкі

У гэтым годзе вучні першага класа гімназіі, у прысутнасці якіх традыцыйна ладзіліся ў Чыжах народныя абрады, запрасілі на школьнае мерапрыемства старэйшых вучняў-гімназістаў і вучняў шостага класа падставовай школы, якія ў наступным годзе будуць арганізатарамі такога ж святкавання. Школьнае мерапрыемства распачалося з агульнага знаёмства з абрадам „Масленіцы”, які ўжо малавядомы нават пакаленню бацькоў сённяшніх чыжоўскіх гімназістаў. У прыгожа аздобленай актавай зале на сценах віселі выкананыя вучнямі рознакаляровыя малюнкі ды недакончаныя сказы на беларускай мове — часткі прымавак аб „Масленіцы”, якія вучням трэба было пасля адгадваць. Гульні распачаліся з загадак, з якімі вучні наогул добра справіліся. Аднак некаторыя загадкі былі цяжкімі таксама і для старэйшых назіральнікаў, але пасля падказак вядучай мерапрыемства, настаўніцы беларускай мовы Веры Флёрчук, вучні з імі таксама справіліся. Настаўніцы дапамагала пераапранутая ў народную вопратку „Маслінка”.

— „Масленіцу” адзначалі на працягу сямі дзён і кожны дзень нечым адрозніваўся ад іншых, — сказала настаўніца Вера Флёрчук, якая старалася прымеркаваць гульні і спаборніцтвы да здарэнняў паасобных дзён гэтага перыяду. Настаўніца расказала, як у першы дзень „Масленіцы”, які называўся „Стрэчаннем”, людзі на падставе з’яў прыроды стараліся прадказаць якім будзе лета. Чыжоўскія гімназісты адгадвалі народныя прыказкі, карыстаючыся фрагментамі сказаў развешаных на сценах. Калі вучні даведаліся пра другі дзень — „Зайгрышы” — плялі касу з ільну (перамагалі тыя пары, якія сплялі самую прыгожую і доўгую). Пры нагодзе гімназістам напомнілі таксама пра значэнне ільну ў жыцці колішніх сялян.

— У нашых сёлах занікаюць старыя абрады. З нашымі багатымі народнымі традыцыямі павінна знаёміцца маладое пакаленне, каб яны жылі хаця ў памяці і свядомасці маладых людзей, — сказаў дырэктар Міраслаў Пяткевіч, які глядзеў гульні і спаборніцтвы разам з кіраўніком Гміннага асяродка сацыяльнай дапамогі Яўгеніяй Кандрацюк.

У чарговы дзень „Масленіцы” зяць ехаў у госці да цешчы. Прымеркаваныя да яго спаборніцтвы зводзіліся да пячэння мужчынамі аладкаў, а дадатковым ускладненнем былі закрытыя хусткай вочы. Паколькі ў маслены перыяд (пасля мясапуснай нядзелі) людзі не елі ўжо мясных вырабаў, вучні навыперадкі елі сыркі і пілі малако, закусваючы яго блінчыкамі.

Людзі ў мінулым многа ўвагі адводзілі народным павер’ям, пра якія сабраным расказала Вера Флёрчук. Хаця зараз насельніцтва Чыжоўскай гміны карыстаецца водаправодам і мыецца ў сваіх хатах, моладзь ахвотна слухала пра колішнія вясковыя лазні і выконвала з бярозавых галінак лазневыя „венікі”. Пачатак быў складаны, бо не было згоды пры дзяльбе галля паміж паасобнымі парамі. Пасля работа ўскіпела і хлопцы выканалі „венікі”, якія хутчэй за ўсё будуць выкарыстаны для замятання панадворка перад школай.

Мерапрыемства вялі настаўніца беларускай мовы Вера Флёрчук і „Маслінка” (Анджаліна Сапяжынская). Загадку адгадвае пераможца ў конкурсах „Беларускай песні” Паўліна Капытка

— „Масленіца” ладзіцца ў прысутнасці гімназістаў упершыню, хаця ў невялікіх групах з гэтым абрадам знаёміліся вучні падставовай школы. Хочам, каб абрады не паўтараліся і таму раней была ў нас „Куцця” і „Шчодры вечар”. Мы спадзяемся шляхам гульняў зацікавіць вучняў народнымі абрадамі, а такая актыўнасць спрыяе вучобе, — кажа настаўніца беларускай мовы Вера Флёрчук, галоўны рэжысёр мерапрыемства, што патрабавала ад яе дэталёвых ведаў аб народным абрадзе і акцёрскіх умеласцей. Зразумела, іншыя настаўнікі беларускай мовы Анна Лаеўская, Валянціна Андрасюк, настаўніца музыкі Людміла Максімюк і выхавацелі класаў, якія прымалі ўдзел у народных гульнях, з’яўляліся суарганізатарамі мерапрыемства. Настаўнікі падкрэслілі таксама дапамогу Праваслаўнага прыхода ў Чыжах, вучнёўскага каператыва, бацькоўскага камітэта і дырэкцыі.

Згодна традыцыі чацвёртага дня вучні не выцягвалі ўжо калодак, але наладзілі „Цешчыны вячоркі” (цешча ехала да зяця), прымеркаваныя да чарговага дня „Масленіцы”. Даведаліся яны таксама як нявестка запрашала мужаву сям’ю ў госці і зноў навыперадкі елі вырабы, падрыхтаваныя на аснове малочных прадуктаў. У сёмы дзень, які выпадаў у нядзелю выбачання правінаў, гімназісты хадзілі да дырэктара школы, заадно гаспадара святкаванняў і прасілі прабачэння за ўсе свае непрыстойныя паводзіны. Аднак настаўніцы беларускай мовы не наракалі на дрэнныя паводзіны вучняў на занятках роднай мовы, а наадварот хвалілі за ангажаванасць моладзі на ўроках.

— Мы стараемся зацікавіць вучняў сваім прадметам і таму на ўроках беларускай мовы ладзім многа конкурсаў. Асаблівы падыход патрэбны ў час навучання граматыкі. Калі мы займаемся з крыжаванкамі і арганізуем актыўныя формы работы на занятках, тады і ўрокі па граматыцы становяцца цікавымі, — гаворыць настаўніца беларускай мовы Анна Лаеўская.

Валянціна Андрасюк дадае, што вучні актыўна прымаюць удзел у разнародных беларускамоўных конкурсах. Заняткі становяцца больш займальнымі, калі вучні могуць на практыцы пазнаёміцца з даўнімі прыладамі працы ў рэгіянальнай зале, якая знаходзіцца ў старым драўляным будынку школы. У гэтым годзе вучні таксама прыносілі экспанаты ў згаданую залу.

Гімназісты чыжоўскай школы звыкліся ўжо, што іх мерапрыемствы, прысвечаныя народным абрадам, ладзяцца па-беларуску і таму загадзя рыхтуюцца да іх на занятках роднай мовы. Напэўна будуць яны яшчэ вяртацца на ўроках да абраду „Масленіцы”.

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

Пляценне касы патрабавала вялікіх умеласцей

Многа весялосці выклікала паспешлівае спажыванне малака і аладкаў

1941 год: немцы на Беласточчыне

На трэці дзень вайны немцы ўжо гналі праз Скідаль ваеннапалонных Чырвонай Арміі, і ўжо разгарнулі тут свой „размеркавальны пункт". Падыходзіў афіцэр Вермахта і на чысцюткай рускай мове беспамылкова выбіраў, тыкаў пальцам і камандаваў „Выходи!", а калі сумняваўся, то проста... махаў рукой і збіваў з галавы пілотку — хто стрыжаны да голай галавы, той на месцы, а хто на галаве з чубчыкам, той „Выходи!" Так адбіралі малодшых камандзіраў — сяржантаў і лейтэнантаў — і „стараслужачых", а навабранцы 1940 ці 1941 года немцаў не цікавілі. Потым адабраных гналі на сто метраў далей... да нямецкай палявой кухні — і кармілі па сваіх франтавых нормах; потым была палатка з Чырвоным Крыжам, лекарам, фельчарам, санітарамі і ўсёй нямецкай франтавой медыцынай; потым другая палатка... з гарачай вадой і мылам, а пры ёй тылавікі... падбівалі, каму трэба, боты і падшывалі гімнасцёркі і галіфэ — і толькі потым другі афіцэр Вермахта паруску пытаў кожнага прозвішча і вайсковы ступень, якога палка і як даўно служыць ды што ўмее, а пісар за простым канцылярскім сталом за ім запісваў. Потым трэці афіцэр Вермахта фарміраваў з перапісаных каманды па 15-20 чалавек, прызначаў „старшего" (!!) — і пад началам гэтага „старшего", ды з адным нямецкім фельдфебелем, ішлі... „на сборный пункт для погрузки" на аўтамабілі і „отправки в Германию на переформировку". Служылі „чубчыкі"... ужо ў нямецкай арміі — бо елі нямецкі хлеб з каўбасой і мыліся нямецкім мылам... і бо ніхто не адмаўляўся; ну, „не заўважылі", як трапілі з арміі ў армію, і не заўважылі ці мала чаго і дзе з прывучаным да парадку вайсковым, „кадровым" чалавекам бывае...

Так немцы адбіралі „рускія рэзервы" для сваіх 201-й, 203-й, 221-й і 286-й ахоўных дывізій тыла групы армій „Цэнтр". А ні свайго псіхаватага „фюрэра", ні ідэолагаў нацысцкай партыі пра такія Ostgruppen („рускія рэзервы")... проста не паведамлялі, хоць гэтыя Ostgruppen на працягу ўсяе вайны налічвалі сотні тысяч людзей, няхай нават... служылі нелегальна, а з зімы 1943 года, пасля Сталінграда, „паўлегальна". Непасрэдны ж загад на адбор і фармаванне Ostgruppen аддалі яшчэ ў траўні 1941 года (!!), за месяц да вайны з СССР, камандуючы групай армій „Цэнтр" фон Бок і галоўнакамандуючы Сухапутнымі войскамі фон Браухіч, патомныя прускія афіцэры, арыстакраты, ніколі не былі ў нацысцкай партыі, абодва былі звольненыя Гітлерам у адстаўку „пасля Масквы"... і скалочвалі „апазіцыю", ці хутчэй, падпольную хунту „пасля Сталінграда".

Згодна з тым самым загадам з траўня 1941 года, іначай выглядала доля пакінутых на „сартавальным пункце" ў Скідалі стрыжаных навабранцаў Чырвонай Арміі, якія... былі лішнія — іх проста гналі далей у Гродна, на левы бераг Нёмана, на хутар Вішнявец, там абнеслі калючым дротам і абставілі вышкамі з кулямётамі... і проста не кармілі, от там, аднаконная бочка буракоў на дзень на ўвесь лагер. Ніхто не ведае, колькі іх было, бо... немцы іх не лічылі (!!), не перапісвалі і не нумеравалі, а проста назбіралі ў такіх, як Скідаль, мястэчках пад Гроднам і Беластокам. Іх „афіцыйна не існавала" з першых дзён вайны, і для таго была ім галодная і халодная смерць за калючым дротам, а хто мацнейшы дажыў ад лета да гразі і снегу, тых заахвочвалі ежай... прабіваць сапёрнымі лапатамі мелкія ямы ў мерзлай зямлі, секчы на кавалкі мёртвых таварышаў і тыя кавалкі закопваць. Ніхто не выжыў на Вішняўцы да вясны 1942 года, а было там ці то трыццаць тысяч чалавек, ці ўсе пяцьдзесят тысяч, ідзі цяпер разбяры... Бо калі там нікога ўжо не было, слупы і вышкі згнілі, а дрот заіржавеў, там хадзілі і капаліся нашы гродзенскія людзі, спадзяваліся хто на залатыя зубы, хто хоць на што карыснае... Гэта ў „польскай Катыні", дзе ў 1940 годзе НКВД расстраляла „по списку и под расписку", а потым так сакрэціла і перасакрэціла, што ў гэтакі лес хадзіць баяліся, гэта там можа быць эксгумацыя, а што можа быць на такім гродзенскім Вішняўцы, тым болей, што пад канец Савецкага Саюза... тут пабудавалі вялікі „спальны раён", з дзіцячымі садкамі і школамі.

Сінагога ў Скідалі, сённяшні выгляд

„Па рабоце" з тымі ваеннапалоннымі, „чубчыкамі" і стрыжанымі, і рассылцы іх у розныя канцы на розную долю, тыя самыя афіцэры Вермахта заняліся, ясная справа... „канчатковым вырашэннем жыдоўскага пытання" і „ліквідацыяй непажаданага бальшавіцкага элемента", пры гэтым за першы тыдзень вайны (!!) ужо была сфармавана нямецкая дапаможная паліцыя, больш вядомая ў польскай літаратуры як Waffen-SS. Часта можна сустрэць і такое, што гэта была „польская нямецкая паліцыя", маўляў, „там служылі адны палякі"... Гэта ізноў так і не так. На Заходняй Беларусі было шмат былых служачых польскай паліцыі да 1939 года, але на абшарах Беларускай ССР да таго ж 1939 года... немцы часта прымалі на службу нядаўніх савецкіх міліцыянтаў, напрыклад, у Полацку першым камендантам дапаможнай паліцыі быў нядаўні... старшы лейтэнант НКВД. Што да паліцыі ў Скідалі, то была яна „польскай", але прыблізна напалову (!!) з даваенных польскіх паліцэйскіх і даваенных... савецкіх міліцыянтаў-палякаў — і мундуры першы час былі даваенныя, у адных такія, а ў другіх гэтакія. Камендант Ян Ашурка быў увогуле аднекуль з цэнтральнай Польшчы, і ніхто яго ў Скідалі не ведаў, але гэты Ашурка спраўна гаварыў па-нямецку, быў здаровы, як бык, і здольны да любой службы... Першую нямецкую паліцыю на Беларусі — і на Захадзе, і на Усходзе — фарміраваў Вермахт, і фарміраваў гэтаксама, як Ostgruppen, тых Waffen-SS. Гэта значыць, што адбор быў не „па нацыянальнасці", але па ранейшай вывучцы... і цяперашняй здольнасці служыць каму заўгодна і спаўняць якія заўгодна загады. Гэта ўжо потым, пад канец 1941 года, афіцэры службы бяспекі СД, ці „гестапоўцы", даволі крытычна ацэньвалі такую „работу" сваіх калегаў з СС і Вермахта, бо пісалі ў рапартах у Берлін нават такое, што „наша дапаможная паліцыя, ад Беластока да Баранавічаў, гэта гатовая і намі ж узброеная польская падпольная армія"... Ну, што тут скажаш?! Канешне, і афіцэры СД мелі рацыю, бо зімой 1944 года мноства палякаў знікла з паліцыі і апынулася ў лесе ў батальёнах і брыгадах АК, а савецкія мемуарысты часта пісалі, што многія з тых „польскіх камендантаў" у мястэчках Заходняй Беларусі... дапамагалі зброяй і амуніцыяй савецкай партызанцы ў 1942, а нават 1943 годзе (толькі савецкая цэнзура не пускала такія запісы ў друк!), але большую мелі рацыю ўсё ж такі тыя афіцэры Вермахта і СС, хто назбіраў „дапаможную паліцыю" ў першыя тыдні акупацыі летам 1941 года, бо служылі паліцаі найперш сабе, а ўжо потым немцам, але разумным немцам гэтага было даволі...

„Жыдоўскі пагром" у Скідалі 1941 года выглядаў без тых біблейскіх сцэнаў, як пазнейшыя пагромы ў Мінску, Слуцку, Баранавічах — па-першае, тых жыдоў „более бедных, чем богатых" (!!), у Скідалі было аднасна няшмат, прыблізна тры тысячы чалавек — не такое было вялікае мястэчка Скідаль, таму і жыдоў больш паловы, але мала — так што „полурота" немцаў з ахоўнай дывізіі ды паўсотні паліцаяў Яна Ашуркі... справіліся з тым „высяленнем жыдоў да гета ў Гродна" за адзін дзень; па-другое, жыдоў у Скідалі ніхто не хаваў і яны тое ведалі... і не ўцякалі, не бегалі, не прасілі, не галасілі і нават золата не прапаноўвалі, хто яго меў. Але ў гродзенскім гета скідальскія жыды надоўга не затрымаліся — было з дзесятак гаспадароў гарбарняў, астатнія ж не рамеснікі, а дробныя гандляры, карчмары ды іх абслуга (у Скідалі на гарбарнях рабілі не жыды, як у Крынках, а „тутэйшыя", праваслаўныя), а такія жыды немцам былі без патрэбы. Так што павезлі іх проста на Auschwitz, і таму „таварная станцыя ў Гродне дагэтуль мянушку нясе Палестына"... Пакінулі ў Гродне толькі тых багатых — усю восень вазілі ў Скідаль, „пакажы, дзе схаваў золата, то жыць будзеш і дзеці будуць!", і жыд паказваў, і немец браў... і ўжо беднага жыда пасылаў на Auschwitz.

З трохтысячнага жыдоўства Скідаля вайну перажылі тры сямействы — адзін быў аптэкар і фармацэўт, або чалавек незаменны любой уладзе, а двух другіх... някепскія краўцы, „мужские и дамские", аднаго звацъ было Олех, а другі так і называўся — Портной, што па-руску значыць кравец. Вось такая была „ціхая смерць Скідаля", іх Скідаля, не нашага, бо „наш Скідаль" паўдзельнічаў толькі тым, што пахадзіў марадзёрамі па пустых жыдоўскіх хатах, следам за панамі немцамі і людзьмі Яна Ашуркі, як „нашае Гродна" па тым Вішняўцы...

Зараз будзе канец тым невясёлым аповедам, і для таго трэба каму нагадаць, а каму патлумачыць, чаму пра „гродзенскі" Скідаль пішу як пра „беластоцкі" — таму што цяпер так, а шэсцьдзесят пяць гадоў назад было іначай... Справа нават не ў тым, што Беласток, Гродна і Скідаль былі ў адной губерні, ваяводстве, вобласці „за царскім і польскім часам", і па 1939 годзе — справа ў тым, што... Падляшша было ў складзе Каралеўства Прусія ў 1795-1807 гадах, а для таго Гітлер лічыў яго нямецкім і загадаў непасрэдна далучыць да Рэйху! Але міністр акупаваных тэрыторый Розенберг памятаў, што няма ў Беластоку нават столькі немцаў ці фольксдойчаў, каб зрабіць з іх адных адміністрацыю і паліцыю, а толькі немец меў у Рэйху права на ўладу і зброю — і міністр выкруціўся тым спосабам, што прыдумаў Bezirk Bialystok, альбо нейкую „акругу, якая дэ-юрэ нямецкая, але дэ-факта толькі асацыяваная з Усходняй Прусіяй", а каб не ламаць сабе галаву яшчэ з „этнічнымі межамі", Розенберг проста спыніўся на межах... польскага Беластоцкага ваяводства і савецкай з 1939 года Беластоцкай вобласці. І вось з якіх „гебітсаў" складаўся „наш нямецкі Bezirk Bialystok" — Беласток, Гродна, Граева, Ломжа, Саколка, Бельск-Падляшскі і Ваўкавыск — а ў Скідалі, Крынках і далей... так і былі гміны, „як за польскім часам", і карціна кругом была прыблізна тая самая, з такім „малым выключэннем", як Jedwabne, таксама належнае да Bezirk Bialystok і да Вялікага Рэйху...

Таму і пішу пра Скідаль, бо сведкі таго, што тут было, яшчэ жывыя, як мой 80-гадовы бацька, ужо летам (!) 1942 года вывезены „на работы" пад Тыльзіт, да баўэра. Гэта нашаму Сакрату Яновічу тая вайна, якую сам перажыў, чамусьці здаецца смешнай, а літаратурная крытыка хваліць яго за тое, а мне, з паваеннага пакалення, усё вышэйнапісанае — і што далей будзе — чамусьці здаецца не смешным, а проста забытым, бо ў архівах таго няма, ці амаль што няма. Таму спісваю гэтыя аповеды — так як пачуў, запомніў, праверыў у кнігах і архівах... і на другіх сведках. На мой розум, нехта знае і такое рабіць, тым болей, тая вайна далёка, а новыя толькі на экранах, і для таго не баляць...

Алесь ЧОБАТ

Пасябравалі з замежнымі суседзямі

Сустрэча вучняў Сярэдняй школы н-р 9 з Брэста і Комплексу школ н-р 3 у Гайнаўцы, якая 10 і 11 лютага адбылася на Гайнаўшчыне, была рэалізаваная ў рамках праекта „Супольна непрацёртым шляхам — культурны абмен і інтэграцыя моладзі" і выклікала вялікае зацікаўленне сярод гайнаўскіх вучняў. Доўга і старанна рыхтаваліся яны да прыёму равеснікаў з Беларусі, бо спадзяюцца трапіць у лік моладзі, якая ў рамках згаданага праекта будзе выязджаць у Беларусь і Украіну. Сустрэча была для вучняў добрай нагодай пагаварыць пра штодзённыя і больш сур'ёзныя справы. Якраз мае маладыя суразмоўцы з Беларусі аказаліся бывалымі ў Польшчы і заходніх краінах Еўропы. Наведаўшы раней Нямеччыну ці Бельгію, выпрацавалі яны свой погляд наконт многіх жыццёвых патрабаванняў, часам і крытычны. Хочуць падарожнічаць па свеце і адначасна не забываць сваю Радзіму — Беларусь — і ў будучыні працаваць для яе дабра.

Невыпадкова сярод брэсцкай моладзі былі дзяўчаты, якія ад многіх гадоў вучацца народным беларускім і замежным танцам. Паказвалі яны ўжо прыгажосць беларускіх танцаў перад нямецкай і бельгійскай публікай, выступалі ў Польшчы і на Кіпры. У час рэалізацыі праекта, падтрыманага Еўрапейскім фондам рэгіянальнага развіцця, будуць яны выступаць з народнымі танцамі перад сябрамі з Гайнаўкі і Львова, паколькі супрацоўніцтва будзе наладжана на ўзроўні трох краін. Танцавальны майстар-клас у Гайнаўскім доме культуры быў падрыхтоўкай да выступленняў танцораў з Беларусі і Гайнаўшчыны.

— У нашым рэпертуары найбольш беларускіх народных танцаў, але мы таксама танцуем згодна з замежнымі традыцыямі, — заяўляе Кацярына Філіст з Брэста. — Каб можна было выступаць за мяжою, трэба доўга трэніравацца. Калі мне было восем гадоў, мая мама завяла мяне ў Брэсцкі дом культуры, каб я там вучылася танцаваць. Спачатку мне не хацелася займацца ў танцавальнай групе, але пасля гэтыя заняткі мне спадабаліся і я танцую па сённяшні дзень.

Доўга ў танцавальным калектыве займаецца таксама Юля Біцяева, якая любіць беларускія народныя танцы.

— Танцы развіваюць пластычнасць цела, а доўгія трэніроўкі станоўча ўздзейнічаюць на наша здароўе, — дадае Віка Іванава. — Я хацела б у будучыні займацца харэаграфіяй і працаваць з маладымі танцорамі.

Вучні Комплексу школ, распаложанага па вуліцы Новаваршаўскай у Гайнаўцы, выступілі перад брэсцкай моладдзю з беларускімі песнямі і мастацкай часткай, а дзве пары запрэзентавалі сучасныя танцы. Госці з Беларусі цікавіліся ўмовамі вучобы і працай пазаўрочных гурткоў. У час прагулак знаёміліся яны з горадам і яго кароткай гісторыяй.

— У час рэалізацыі праекта будзе магчымасць пазнаёміцца з культурнай спадчынай беларусаў, палякаў і ўкраінцаў ды багатай прыродай памежных рэгіёнаў. Вучні змогуць разгарнуць свае зацікаўленні і пазнаёміцца з замежнай моладдзю. Наша школа ладзіла ўжо супрацоўніцтва са школамі з Беларусі, але вучні заангажаваныя ў замежнае сяброўства закончылі ўжо ў нас адукацыю і яно спынілася. Зараз ёсць у нас надзея, што пасля заканчэння рэалізацыі нашага праекта абмен моладдзю паміж нашымі школамі не спыніцца і ў наступных гадах вучні будуць працягваць супрацоўніцтва ў розных галінах, — кажа каардынатар праекта настаўніца Галена Сачко і звяртае ўвагу на ангажаванасць дырэктар школы Ірэны Кулачэўскай ды пералічвае прозвішчы іншых педагогаў, занятых пры рэалізацыі праекта.

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Спатканне моладзі з Брэста (на першым плане) і Гайнаўкі (стаяць ззаду). Мае суразмоўцы з Беларусі сядзяць пасярэдзіне

У Белавежы госці з Беларусі наведалі Прыродазнаўча-лясны музей. Мелі яны таксама нагоду паглядзець прыгожыя зімовыя краявіды ў Белавежскай пушчы і лясную звярыну ў Паказным запаведніку зуброў. Мае брэсцкія суразмоўцы вядуць актыўнае жыццё і апрача ўдзелу ў пазаўрочных гуртках займаюцца таксама спортам. У свабодны час Анна Шаўлінская гуляе ў тэніс, а Эрнст Брык — у футбол. Дзяўчаты-танцоркі высокія ростам і можа таму любяць іграць у баскетбол. Іх сяброўка Хрысцінія многа часу адводзіць на музычныя заняткі.

— У школе самыя займальныя для нас заняткі — урокі англійскай мовы, але любім таксама вучыцца беларускай мове і знаёміцца з нашай гісторыяй, — кажуць дзяўчаты і адначасна дыпламатычна тлумачаць, што любяць таксама хадзіць на ўсе іншыя ўрокі, бо працуюць з імі добрыя настаўнікі.

Мультымедыйная прэзентацыя дзейнасці гайнаўскай школы, яе поспехаў, гісторыі горада і яго цікавейшых месцаў была падрыхтаваная вучнямі і настаўнікамі ў рамках рэалізаванага праекта. Моладзь з Брэста і Львова таксама будзе працаваць з камп'ютэрамі, каб пасля прадставіць інфармацыю аб сваіх школах, гарадах і гістарычных героях. Можна будзе гэта выкарыстаць у конкурсе ведаў аб партнёрскіх гарадах, які будзе адным з завяршальных этапаў праекта. Велікодныя абрады вучні будуць параўноўваць у час чарговых заняткаў. Моладзь будзе таксама ўдзельнічаць у адукацыйных занятках у Белавежскім нацыянальным парку і знаёміцца са спосабамі аховы прыроды ў нашай пушчы.

— Падрыхтоўка да супрацоўніцтва і рэалізацыя праекта патрабуе вялікай ангажаванасці вучняў і настаўнікаў. Аднак замежныя выезды з'яўляюцца вялікім козырам і гэта моцна заахвочвае да работы, — гаворыць настаўніца Галена Сачко. — Усе ўдзельнікі праекта будуць выдаваць невялікія альбомы аб сваіх школах і гарадах. Прадбачваем яшчэ ладзіць выстаўкі, якія падвядуць вынікі праекта, які закончыцца ў кастрычніку гэтага года.

Сяброўства замацоўвалася ў час танцаў у доме культуры і каля вогнішча ў Белавежскай пушчы. Вучні цікавіліся жыццём за мяжой і размаўлялі на розныя тэмы. Брэстаўчане нават не скрывалі сваіх планаў на будучыню і мараў. Моладзь з Брэста хацела б спачатку здабыць добрую адукацыю, а пасля засноўваць сем'і.

— Я ў будучыні хацела б стаць юрыстам або фармацэўтам, — сказала Каця Філіст.

Яе сяброўка хацела б працаваць мадэльерам і праектаваць вопратку, а Эрнст Брык хацеў бы стаць камп'ютэрным праграмістам.

— Я мару, каб мая будучая сям'я была ўдалай. Добра было б, каб муж любіў мяне і добра разумеў, а паміж намі не было сварак. Хацела б я таксама мець многа дзяцей, але зарабляць столькі, каб хапіла на ўтрыманне сям'і, — кажа Кацярына Філіст.

— Каб добра склалася жыццё, трэба згодна жыць у сям'і і знайсці работу, якая будзе задавальняць, — дабаўляе Алёна Любчук, якая раней таксама займалася ў танцавальным калектыве.

Некаторыя дзяўчаты з Брэста, якія пабывалі ў заходніх краінах, хацелі б здабываць добрую адукацыю за мяжой.

— Здабыўшы салідную замежную адукацыю, я хацела б вярнуцца ў Беларусь, каб працаваць для сваёй краіны, — гаворыць Кацярына, а яе сяброўка Віка разважае, ці даўжэй не астацца за мяжой, але дабаўляе, што таксама любіць Беларусь і хацела б дапамагаць Радзіме.

— Яшчэ раней я хацела б наведаць Лондан або Парыж, бо ў Маскву страшна ехаць з-за тэрарызму, — кажа Віка Іванава.

— Я хацеў бы вучыцца і жыць у Польшчы, бо тут вышэйшы стандарт жыцця і з Польшчы можна свабодна выязджаць у розныя краіны Еўропы, — гаворыць Эрнст Брык.

— Мой дом — Беларусь, дзе цябе ўсе любяць, — заяўляе танцорка Юля Біцяева і дабаўляе, што бачыць сваю будучыню толькі на Радзіме.

Калі прашу іншых вучняў расказаць пра сваю Радзіму, адразу заяўляюць яны, што Беларусь з'яўляецца адной з самых чыстых і прыбраных краін, якія ўзніклі пасля развалу Савецкага Саюза і ў прыклад ставяць выгляд вуліц Брэста. Паколькі беларуская моладзь наведала Гайнаўку завеяную снегам, не магла яна належным чынам ацаніць вынікаў працы нашых гарадскіх камунальных службаў, за выключэннем тых, якія расчышчаюць вуліцы і тратуары.

Аляксей МАРОЗ